Кнігарня Наша Ніва

Алесь Аркуш, Барыс Козік

# БРЫЗГАЛАЎКА

Мінск
Выдавец І. П. Логвінаў
2009

УДК 822.6
ББК 84 (4Беи)
А 30

Сэрыя заснаваная ў 2006 г.

**Аркуш, А.; Козік, Б**

А 30 Брызгалаўка: Жодзінскія аповеды, успаміны і вершы / Алесь Аркуш, Барыс Козік. — Мінск: І. П. Логвінаў, 2009. — 86 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»)

ISBN 978-985-6901-15-0

**УДК 882.6**
**ББК 84 (4Беи)**

© Алесь Аркуш, Барыс Козік, 2009
© Выдавец І. П. Логвінаў, 2009

**ISBN 978-985-6901-15-0**

Алесь Аркуш

# БРЫЗГАЛАЎКА

Жодзінскія аповеды, успаміны і вершы

# СЬВЯТЛО ВЯСНЫ

Вясной сьвятло зусім іншае. Яно лагоднае. Не, інакш. Яно галаграмнае. Яно набывае новыя аб'ёмы, новую глыбіню. У яго можна ўвайсьці й зьнікнуць. Заблукаць, заблу-каць, за-блу-каць... у празрыстасьці.

Калі аблокі нібыта кранаюць верхавіны таполяў. Калі дрэвы яшчэ голыя, але ўжо абуджаныя. Ахутаныя сьвятлом. Ствалы, пасьвятлеўшыя, вільгатнеюць ад хваляваньня.

І яшчэ — сьвятло радаснае. І гэтай радасьцю кранае цябе. Як дзявочы дотык. Выпадковы. Нечаканы. Які — ты гэта ведаеш — насамрэч інсьпіраваны, і ад гэтага веданьня табе радасна й сьветла.

Ты выходзіш на двор у вясну. Дакранаесься рукой да сьцяны свайго цаглянага двухпавярховіка і з прыемнасьцю грэеш далонь. О, гэта ўжо вясна сапраўдная! Яна грэе тваю далонь і кліча ў квецень.

Ад зыркага сьвятла ты мружыш вочы, сам сабе пасьміхаесься. Сьвятло цябе кранае радасьцю. Канікулы. Нікуды ня трэба сьпяшацца.

З раніцы ты чытаў кнігу. Штосьці пра вандроўкі па далёкіх, дзіўных, экзатычных краях. У галаве яшчэ засталіся малюнкі сюжэту. І гэтыя малюнкі няўзнак накладаюцца на звыклы «трафарэт» твайго двара, надаючы навакольнай звыкласьці нязвыклую рамантычнасьць.

Недзе ў гэты час звычайна прыходзіць паштарка. Ты чакаеш яе. Стаіш ля свайго пад'езда і выглядаеш кабету зь цяжкай, брухатай сумкай.

Яна ўсё адно зьявіцца нечакана, выйдзе з-за рогу твайго дома, недзе ў пяці мэтрах ад цябе, звыклым пасьпешным крокам, пройдзе побач. Ты не падаш выгляду, што яе чакаеш. Павітаесься. Затым вытрымаеш паўзу. Кабета выйдзе з твайго пад'езда і схаваецца ў суседнім. Вось цяпер пара.

Некалькі крокаў, і ты ля паштовых скрыняў, што вісяць побач з дзьвярыма бацькоўскай кватэры. Сёньня павінна быць літаратурная старонка ў мясцовай газэце. І ў ёй твае вершы. Пра вясну.

*7.12.2007*

# БЫЛО БАЛОТА

«Тут было балота», — адказаў мой бацька, калі я спытаў яго, што раней знаходзілася на месцы пасёлка ДРЭС. Апошнія балотныя «выспачкі» ў ваколіцах пасёлка існавалі яшчэ на маёй памяці. Памятаю невялічкае балотца, што было побач з электрастанцыяй, пад трубаправодам, па якім вада несла залу на залаадвал — штучныя вадаёмы, дзе вада адстайвалася, а зала ад згарэлага ў катлах паліва ападала на дно, актыўна наслайваючыся пласт на пласт, пакуль вадаём не ператвараўся ў мёртвае поле. Падчас майго дзяцінства Смалявіцкая ДРЭС працавала пераважна на вуглі й торфе. Апошні здабываўся галоўным чынам на торфаздыбываючым прадпрыемстве пасёлка Зялёны Бор.

Першы залаадвал быў утвораны практычна за станцыйным плотам. На яго месцы зараз знаходзіцца цяплічная гаспадарка. Будаўнікі панавозілі грунту, засыпалі мэтровыя пласты залы, і мёрвае, на дзіва раўнюткае «плата» паміж ДРЭСам і Судабоўкай пачало зажываць. А вось падчас майго дзяцінства гэта быў марсіянскага выгляду куточак зямлі. Мёртвы прасьцяг зь дзіўным шэра-антрацытным колерам грунту. Там толькі дзе-нідзе рос мох.

Пазьней, відавочна, у сярэдзіне 60-х, залаадвал перанесьлі на значную адлегласьць, дзе ён знаходзіцца і зараз, побач з дарогай на Зялёны Бор. Ня ведаю, ці ў працоўным ён стане зараз, бо ў 90-х гадах катлы станцыі пераабсталявалі пад новае паліва — газ. Пры спальваньні газу, наколькі я разумею, залы не застаецца. Таму непатрэбны й залаадвал. Праўда, апошнім часам, у сувязі са значным павелічэньнем кошту на газ, у нашай краіне зноў згадалі пра мясцовыя віды паліва, у тым ліку й пра торф. Якім чынам да яго будуць вяртацца на Жодзінскай ЦЭЦ, ня ведаю, бо, пераходзячы на газ, зьнішчылі ўсю

торфаздабываючую інфрастуктуру, у тым ліку разабралі вузкакалейкі, што вялі да тарфяных радовішчаў. Для іх аднаўленьня патрэбны вялікія інвэстыцыі.

Але вернемся да балота. Гэтае балотца, што месьцілася побач са станцыяй, было адным зь любімых месцаў маіх гульняў. Мне падабалася скакаць па купінах, што тырчалі сярод вады, а яшчэ больш — лавіць апалёнікаў і трытонаў. Разам з аднагодкамі са свайго двара я днямі прападаў на тым балотцы. А яшчэ мы любілі хадзіць па трубах, што несьлі залу ў залаадвал. Трубы йшлі па бэтонных слупах, высока над балотцам. Найбольш сьмелыя аднагодкі хадзілі па іх ледзь ні да самай станцыі. Але існавала небясьпека, бо зьнізу ішла жвавая дарога на Судабоўку і нас пэрыядычна ганялі з тых трубаў дзядзькі-шафёры. Таму часьцей хадзілі ў адваротным кірунку — да новага залаадвалн. На «марсіянскім плата», тэрыторыі старога залаадстойніка, трубы йшлі па зямлі. А вось за плотам сёньняшняга прадпрыемства «Энергаканструкцыя» яны зноў узьбіраліся на слупы, і хадзіць па іх было ўжо цікавей. Так па трубах мы крочылі да самога месца зьліву бруднай вады. Тут было цікава: шмат чаек, якія ўвесь час гучна галёкалі, вялікія вадаёмы, вадаспадны гул зьліву вады. Мы называлі гэтае месца *дамба.*

Нярэдка мы заяжджалі на роварах на дамбу, вяртаючыся з рыбалкі з Судабоўскага возера. Езьдзілі, як правіла, сяброўскай дваровай кампаніяй. Нехта з нас падаў ідэю зарыбіць дамбу, таму невялікіх карасікаў, якія трапляліся на нашыя кручкі, не выпускалі назад у возера, а везьлі да штучных тэхналягічных вадаёмаў. Напэўна, большасьць карасікаў у неспрыяльных для жыцьця ўмовах гінула. Але, відавочна, нехта й выжыў, бо праз гадоў 15 некаторыя з тых вадаёмаў сталі ўлюбёным месцам рыбалкі для многіх жодзінцаў.

*10.12.2007*

# ПАД ШАТАМІ СТАРЫХ ЛІПАЎ

У дзяцінстве ў мяне нават і не ўзьнікала пытаньня: чаму на гэтым месцы расьлі купкаю старыя ліпы, а навокал нідзе старых ліпаў не было? Гэтыя велічныя дрэвы я бачыў ад малых гадоў, і яны былі чымсьці звыклым, як сонца, неба й рачулка Пліса. У мяне не ўзьнікала пытаньня: чаму яны тут? Пра будзёнае не пытаюцца. Пры гэтым, я не стамляўся зьдзіўляцца іх прыгажосьці. Калі яны разам апраналіся ў залаціста-смарагдавую квецень, дык мядовы пах ад ліпаў, здаецца, можна было пачуць за кілямэтар. А як гучна гулі пчолы ў вершалінах-аблоках! Тысячы, мільёны пчол!

Дзіўна: калі б ліпы не былі старымі, дык і не было б той прыгажосьці. Прыгажосьць заключалася менавіта ў старавечнасьці. Гэтыя ліпы нібыта сьведчылі, што тут людзі жылі з даўніх часоў і вось пакінулі пра сябе гэты прыгожы напамін.

У дзяцінстве мне хацелася ўзьлезьці на самую высокую ліпу і паглядзець на свой горад з вышыні птушынага палёту. Але я так і не насьмеліўся гэта зрабіць.

Ліпы я бачыў амаль штодзень. Пад імі я праходзіў, калі йшоў да дзеда з бабай на Партызанскую, яны жылі амаль насупраць чыгуначнага вакзалу, або калі йшоў на сам чыгуначны вакзал, бо езьдзіў электрычкай на заняткі ў Менск у наргас.

Побач зь ліпамі знаходзіліся дзьве мае ўлюбёныя культурніцкія ўстановы: кінатэатар «Юность» і дзіцячая бібліятэка, якая непасрэдна хавалася ў засені веліканаў.

Менавіта ад бацькі, якога прывезьлі ў Жодзіна немаўлём, і на вачах якога чыгуначны паўстанак ператварыўся ў горад, я даведаўся, што побач зь ліпамі некалі стаяла царква. Калі я крыху падрос, пайшоў у школу, кожны раз, калі мы з бацькам міналі ліпавую выспу, чуў ягонае наракanne:

«І навошта яе зьнесьлі, каму яна замінала?» — абураўся бацька. Ён атрымаў атэістычнае выхаваньне, але зь яго ня вытруцілі разуменьне, што руйнаваць царкву — гэта вандалізм.

Царква тая мусіла захавацца недзе ў глыбінях маёй памяці, бо нарадзіўся я ў 1960 годзе, а яе зруйнавалі ў 1963-м. Значыць, я бачыў жодзінскую бажніцу на ўласныя вочы. Больш таго, мяне хрысьцілі ў папоўскім дамку побач з царквою (менавіта гэтая папоўская хата была ператворана ў дзіцячую бібліятэку). Ужо пазьней, калі я пабачыў здымкі таго просьценькага драўлянага храму, я пачаў нібыта ўзгадваць яго. Мне бачыцца невялікая занядбаная бажніца, якая хаваецца за старымі ліпамі, нібыта шукаючы ў іх абароны. Чамусьці гэты малюнак узьнікае абавязкова ў ранішняй смузе. Першыя сонечныя промні прабіваюцца празь вершаліны дрэў. А там, далей, у бок пасёлку ДРЭС, над ракой густы ранішні туман. Ён цёплы, надзвычай цёплы. Ён хавае яшчэ нешта знаёмае. Ці то тутэйшы ландшафт? Ці то нейкі дзіцячы ўспамін? А можа, проста маленькага хлопчыка з вудай у руках, які, узіраючыся ў веліканы-ліпы, думае пра нешта сваё?

*13.12.2007*

* * *

на царковішчы
засталіся
апошнія волаты-ліпы

ты добра памятаеш
як раней яны суладна
цьвілі штотравень

казачная краіна
з кветак і пчолаў

на месцы царквы
пабудавалі
прадуктовую краму

а неўзабаве
пачалі зьнікаць ліпы

ліпы тваёй казкі

дзякуй дарагія
што часам
прыходзіце ў сны
і дасылаеце
вестачкі праз пчол

* * *

шлях ад электрычкі
да матчынага дому

колькі разоў ім кіраваўся!

у розныя бакі

і вельмі рана-раненька
і ўдзень і ўночы

нёс думкі і мары

а яшчэ
матчына блаславеньне
і клопат і трывогу

пакуль гэты шлях існуе
датуль я прывязаны пупавінай
да цябе
мой родны горад

# КРАМА НА ВУЛІЦЫ СПАРТЫЎНАЯ

Гэта была самая лепшая крама ў пасёлку ДРЭС. Не, што вы, ня віна-гарэлачная. Дарэчы, у 80-х, калі з алкагольнымі напоямі стала надзвычай праблематычна, віно й гарэлку на ДРЭСе пачалі прадаваць у былым пункце прыёму шклотары, які месьціўся за лазьняй, дакладней, з адваротнага боку крамы «Культовары» (пазьней крама «Одежда»). О, якія ў свой час да гэтай гандлёвай кропкі вялі чэргі, якія тут віравалі жарсьці! Бо мала было мець талёнчык на запаветную пляшку, трэба было яшчэ той кавалачак паперкі атаварыць. І тут нярэдка ў ход ішлі і кулакі, і моцныя выразы, і вагавыя перавагі.

Мая любімая крама таксама была побач з эпіцэнтрам дрэсаўскага жыцьця, у якіх дваццаці кроках ад пункту рэалізацыі гарачыцельных напояў, і ў ёй таксама пэрыядычна, у дні прывоза тавару, узьнікалі чэргі. Нават больш таго, — месца ў тых чэргах людзі займалі яшчэ зь вечара перад днём прывозу. А называлася тая крама «Кнігі».

Невялікі цагляны дамок, які напачатку 60-х адмыслова пабудавалі пад кнігарню, знаходзіўся на вуліцы Спартыўнай, што вяла на дрэсаўскі стадыён. Дарэчы, той дамок дасюль стаіць на сваім звыклым месцы, але даўно ўжо ў ім не прадаюць кнігі. І выглядае ён занядбана і маркотна. А шкада! Колькі прыемных уражаньняў у мяне зьвязана з гэтай культурнай сядзібай, месцам сустрэчы ўсіх жодзінцаў, якія імкнуліся чытаць, разважаць і мець свае ўласныя думкі. Я да сёньня памятаю ўсе твары жанчын, што працавалі ў кнігарні. І загадчыцу памятаю. Гэта быў вялікі чалавек у дрэсаўскай гіерархіі. Бо менавіта яна, трэба меркаваць, забясьпечвала дэфіцытнымі кнігамі ўсіх начальнікаў і патрэбных людзей горада, а ў замен магла мець нейкія іншыя дэфіцыты і прывілеі. Па-шчырасьці кажучы, загадчыца тая больш за начальнікаў паважала

проста інтэлігентных людзей, якім тыя кнігі былі насамрэч патрэбныя, таму магла практычна на вачах у іншых наведвальнікаў крамы ашчасьлівіць з-пад паліцы якоганебудзь студэнтыка худграфа чымсьці дэфіцытным. Шэраговыя наведвальнікі з разуменьнем ставіліся да такога права загадчыцы. Але час ад часу ўсё ж успыхвалі канфлікты з пагрозамі й нецэнзурнай лаянкай. Ці мелі яны нейкія наступствы для загадчыцы, ня ведаю.

Асноўныя гарадзкія начальнікі месьціліся пасуседзтву — у будынку гарвыканкама, які доўгі час знаходзіўся на цэнтральнай плошчы ДРЭСу. Ясна, што скаргі маглі паступаць менавіта ў гэтыя кабінеты, і ясна, што яны вырашаліся, так бы мовіць, у рабочым парадку. Сёньня ў былым будынку гарвыканкама, у адміністрацыйным двухпавярховіку з калёнамі, ствараецца гарадзкі музэй, і я гэтым надзвычай усьцешаны, і гатовы, наколькі магчыма, спрыяць яго паўставаньню.

Але вернемся ў нашую маленькую кнігарню. За маім дзяцінствам у горадзе была яшчэ адна кніжная крама — на Дзяржынцы, побач з палацам культуры БелАЗа. Але, трэба сумленна прызнаць, дрэсаўская кнігарня была больш аўтарытэтнай і ўтульнай. Ня ведаю, як часта яе наведвалі жодзінцы зь іншых куткоў горада, а я бываў тут практычна штодзень.

Згадваецца яшчэ адна асаблівасьць тагачаснага кніжнага гандлю. Напэўна, падобная форма распродажу неліквідаў была пашырана па ўсёй Беларусі ці нават СССР. Называлася яна — бяспройгрышная лятарэя. Каштавала 10 капеек. Кожны яе ўдзельнік абавязкова штосьці выйграваў: якуюсь кнігу, што была уцэненая да 5-6 капеек, а калі шанцавала, мог дастаць 50 капеек, а то й цэлы рубель. На гэтыя грошы ты павінен быў выбраць тавару ў магазіне. Акрамя кніг, тут прадаваліся і вучнёўскія сшыткі, і асадкі, і іншыя рэчы для школы. Ня памятаю, ці выйграваў я калі рубель. Мо й выйграваў. А вось удзельнічаў у той лятарэі шмат разоў. У бібліятэцы маіх бацькоў багата кніг, якія дасталіся ў якасьці суцяшальнага прыза. Нядаўна, гасьцюючы ў бацькоў, я іх пераглядзеў. Практычна ўсе яны

беларускамоўныя. Большасьць прозьвішчаў аўтараў нічога не гавораць нават мне. Я такіх пісьменьнікаў проста ня ведаю. Праўда, ёсьць сярод іх і добрыя кнігі, пераважна дзіцячыя. Трэба прызнаць, ўцэненых кніг у краме было шмат. Сёньня шкадую, што ў свой час не скупіў усю паліцу уцэненай беларускай паэзіі. Большасьць тых кніг былі выдадзеныя надзвычай прыгожымі. Я нават памятаю месца, дзе яны, небаракі, чакалі свайго макулатурнага часу *ікс*. А я іх мог выратаваць. І каштавала б мне гэта ўсяго некалькі рублёў. Максім Танк, Пімен Панчанка, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін. Сёньня кошты на гэтыя кнігі, як акцыі пэрспэктыўных кампаніяў, стромка ўзьняліся ў гару. А тыя кнігі, за якімі людзі душыліся ў чэргах, тыя Друоны, Дзюма, Зошчанкі, Джэкі Лёнданы, сёньня практычна нічога не каштуюць. І не таму, што кепскія аўтары. Аўтары якраз добрыя. Проста гэтыя кнігі пазьней дзясяткі разоў перавыдаваліся і значна больш якасна. Таму тыя сьціплыя кнігі, з 70-х і 80-х, сёньня нікога не цікавяць. А вазьміце ў рукі тагачасныя зборнікі паэзіі Рыгора Барадуліна. Гэта шэдэўры! Зь якой любоўю над імі працавалі беларускія мастакі й паліграфісты. Гэтыя кнігі не перавыдаваліся, і засталося іх ня шмат. Яны самі па сабе творы мастацтва. Таму й каштуюць у букіністычных крамах адпаведна.

Жыцьцё само расстаўляе ўсё на адпаведныя паліцы. І як часта мы памыляемся ў ацэнках!

Пазьней я купляў любімыя паэтычныя зборнікі дзясяткамі экзэмпляраў — Алега Мінкіна, Анатоля Сыса, Леаніда Дранько-Майсюка, — усе яны разыходзіліся па сябрах.

На жаль, мая любімая кнігарня не дачакалася таго часу, калі на яе паліцу магла б стаць і мая кніга. Але я не губляю аптымізму й па-ранейшаму спадзяюся — прыйдзе яшчэ Скарынаўскае сьвята і на вуліцу Спартыўная.

*14.12.2007*

# ДОМ КУЛЬТУРЫ ДРЭС

## 1

Мне заўжды падабалася месца, на якім стаіць Дом культуры Смалявіцкай ЦЭЦ. Насамрэч, Смалявіцкая ЦЭЦ месьціцца зусім не ў Смалявічах, а ў маім родным Жодзіне. Калі будавалася электрастанцыя, а было гэта ў канцы 40-х — напачатку 50-х, Жодзіна ўяўляла сабой невялічкі пасёлак вакол чыгуначнага паўстанку. Стратэгічны індустрыяльны аб'ект знаходзіўся ў падпарадкаваньні райцэнтру Смалявічы і называўся Смалявіцкая дзяржаўная раённая электрастанцыя, альбо Смалявіцкая ДРЭС. Пасёлак, які паўстаў побач са станцыяй, таксама зваўся ДРЭС. І школу энэргетыкі мелі сваю: вялікую, двухпавярховую — №1. І сталоўку-рэстарацыю. І помнік Леніну, які традыцыйна, як ва ўсіх райцэнтрах і мястэчках, паказваў рукой у бок «кропкі», дзе можна выпіць і закусіць. І шматлікія крамы, у тым ліку мая ўлюбёная кнігарня. І Дом культуры. Ня нейкі там пасялковы клюб, а велізарны гмах клясычнай для таго часу архітэктуры, з псэўдарымскімі калёнамі ля ўваходу. Гэты будынак і цяпер велічна ўзвышаецца над прыгожай поймай ракі Пліса. Правы высокі бераг быў наш, дрэсаўскі. Мы былі гарадзкімі. На супрацьлеглым беразе знаходзіўся пасёлак саўгасу «Загор'е». І мы глядзелі на суседзяў заўжды са стромы, з вышыні.

Адтуль, дзе месьціцца Дом культуры, сапраўды адкрываецца цудоўны краявід. Правы бераг узвышаецца як бы двума прыступкамі. Спачатку вельмі стромка, мэтраў на восем-дзесяць, а затым яшчэ разы ў два вышэй, але павольна, безь небясьпечнай стромкасьці. Вось гэтая горка ля Дому культуры і была месцам нашых улюбёных зімовых забаваў. Нават у самыя лютыя маразы тут зьбіралася амаль уся дзятва пасёлку. З санкамі й лыжамі.

І гойсаньне доўжылася да зьмярканьня. Усякае бывала: насы разьбівалі й рукі ды ногі ламалі. Але пасьля акрыяньня небаракі абавязкова вярталіся да сваёй улюбёнай забавы.

Гэтая горка мне падабалася і летам. Пліса ўнізе рабіла некалькі велягурыстых петляў,ператвараючы краявід у нешта адмысловае. Ня ведаю, ці аздобленая Пліса ў якім іншым месцы гэткім прыгожым ландшафтам. На жаль, ніколі далёка не вандраваў усьцяж ракі дзяцінства. У гэтым жа краявідзе была адмысловая гармонія: ён выклікаў пачуцьцё ці то велічнасьці (краявід з вышыні), ці то лагоднасьці й супакою (гармонія невялікай рэчкі зь вербамі і аеравымі палосамі па берагах), ці першага й другога разам.

Пазьней, калі я пачаў цікавіцца гісторыяй, у мяне нарадзілася думка: ня можа быць, каб на такім прыгожым узгорку не існавала старога паселішча. Вельмі зручнае месца. Побач рака, па якой можна сплысьці ў Бярэзіну, а па ёй і ў Дняпро. У старыя часы рэкі былі асноўнымі сродкамі камунікацыі. І расьсяленьне-каляніізацыя адбывалася ўздоўж рэк. Месца высокае: і паводка не зашкодзіць, і ворага здалёк можна заўважыць. Карацей, з усіх бакоў выгода. Самастойна правесьці архэалягічныя дасьледваньні, ясная рэч, я не рашыўся. Але аднойчы ўсё ж надарылася крыху папоркацца тут рыдлёўкай. Нашая СШ №1 месьціцца па-суседзтву з ДК. Школьнае кіраўніцтва неяк вырашыла — а было гэта ў 70-я гады мінулага стагодзьдзя — арганізаваць у сквэрыку, што атачаў з аднаго боку ДК, невялікую спортпляцоўку для школьнікаў. Я асабіста выкапаў некалькі ямаў пад слупы. Чыстая гліна. Ніякіх сьлядоў культурнага слою. Гэта мяне моцна расчаравала.

Значна пазьней у маёй галаве нарадзілася іншая думка: на такіх месцах паўставалі не паселішчы, а жэглішчы, культавыя аб’екты. Даказаць гэта будзе цяжка: будоўля ДК спляжыла ўсё, што магло захавацца. Але мне асабіста такога доказу й ня трэба. Магія сьвятых мясьцінаў не патрабуе каталягізацыі ды навуковага абгрунтаваньня.

Хрысьціяне-місіянэры на месцах паганскіх жэглішчаў будавалі цэрквы. Тут з храмам не атрымалася. Затое пабудавалі Дом культуры.

## 2

А зараз распавяду пра сам ДК ДРЭС. Ня памятаю, калі ўпершыню я патрапіў у сярэдзіну гэтага найвялікшага гмаху нашага пасёлку. Відавочна, было тое ў зусім малым узросьце і, напэўна, на сьвята Новага году. Мае бацькі працавалі на Смалявіцкай ДРЭС, таму ўсе сьвяты яны адзначалі ўрачыстымі паседжаньнямі ў дрэсаўскім Доме культуры. А на Новы год для дзяцей энэргетыкаў у ДК ладзілася сьвяточная елка з усімі адпаведнымі навагоднімі атрыбутамі: вялікай зялёнай прыгажуняй пасярод залі, Дзедам Марозам і Сьнягуркай, карагодамі, сьпевамі і падарункамі. З працы бацькі прыносілі адмысловую паштоўку, за якую Дзед Мароз і выдаваў кожнаму пакунак з цукеркамі. Вялікім горам было захварэць пад Новы год і не атрымаць падарунка з рук Дзеда Мароза. Праз якіх пару дзён хтосьці з бацькоў прыносіў тыя цукеркі з працы: недзе ў прафкаме іх, натуральна, аддавалі, але гэта ўжо было ня тое: парушаўся рытуал, а дзіцё пазбаўлялася сьвяточных пачуцьцяў. І гэтыя пачуцьці ў дрэсаўскай дзятвы былі непарыўна зьвязаныя з ДК, горкай над Плісай і надрэчным краявідам.

Затым, калі я пайшоў у школу, пачаўся іншы пэрыяд маіх дачыненьняў з ДК ДРЭС — кінэматаграфічны. Многія культавыя савецкія фільмы ўпершыню я пабачыў менавіта ў будынку на маляўнічым узвышшы. Адзін летні месяц я абавязкова праводзіў у піянерлягеры Смалявіцкай ДРЭС «Чайка». Дарэчы, лягер той да сёньня месьціцца на беразе Плісы, у трох кілямэтрах ніжэй гораду. Праўда, ля «Чайкі» нічога адметнага ў ландшафце няма. Рачулка практычна незаўважная пасярод роўнядзі палёў і невялікіх лапікаў лесу. Адзінае, што памятаецца: купаньне ў рацэ й конкурсы рыбаловаў, у якіх я звычайна браў удзел. Лавіліся

плоткі, печкуры, акунькі. Я налаўчыўся спрытна лавіць уклеяк і часта перамагаў у тых спаборніцтвах, здабываючы ачкі для свайго атраду. А яшчэ, памятаецца, штотыдзень нас вазілі ў кіно ў ДК ДРЭС. Аўтобусамі дастаўлялі ці ня ўвесь лягер. У залі ўздымалася бязладная гамана й вэрхал. Бесперапынна стукалі драўляныя сядзельцы крэслаў, хтосьці кагосьці клікаў, хтосьці ня мог падзяліць лепшыя месцы. Але як толькі патухала сьвятло і пачынаў стракацець кінапраектар, рабілася ціха — кінэматаграфічная дзея хутка ўтаймоўвала самых няўрымсьлівых вісусаў. Памятаецца, менавіта пры такім калектыўным праглядзе я ўпершыню пабачыў «Няўлоўных мсьціўцаў». Колькі затым было абмеркаваньняў і пераказаў кіношнага прыгодніцкага сюжэту!

Калі вярнуўся з войска, у маім Доме культуры фільмы ўжо не круцілі. Гэта стала эканамічна невыгодна. Пасёлак ДРЭС ператварыўся ва ўскраіну Жодзіна — гарадское жыцьцё пачало віраваць вакол заводу БелАЗ і, адпаведна, Дому культуры аўтазаводу, які мне ніколі не падабаўся. Гэта быў ужо нейкі вычварны гігантызм. Прынамсі, у Полацку, дзе я цяпер жыву, белазаўскі гмах няма з чым параўнаць. Нават груваскі былы Дом афіцэраў, які таксама зьдзіўляе памерамі на тле старых двухпавярховых камяніцаў, не выглядае так сувора.

Але вернемся ў 70-ыя. У ДК ДРЭС была цікавая бібліятэка. Я ня ведаю, якім чынам фармаваўся яе кніжны фонд, але тут можна было пабачыць і тагачасныя савецкія кнігі, і дарэвалюцыйныя. Магчыма, яны патрапілі з прыватных бібліятэчных збораў сьпецыялістаў, што прыехалі на Смалявіцкую ДРЭС з Расеі. Напрыканцы 70-х гэтыя старыя кнігі зь яцямі пачалі сьпісваць у макулятуру і тое-сёе я здолеў уратаваць. Напрыклад, кнігу Салтыкова-Шчадрына «Современная идиллія» з аўтографам аўтара. Пазьней я паказаў яе таварышу-паэту Анатолю Сысу, які загарэўся разблытаць лёс тома ў скураной вокладцы. Ён пачаў пісаць лісты ў розныя навуковыя літаратурныя ўстановы, у тым ліку і ў ленінградскую бібліятэку імя Салтыкова-Шчадрына. Кніга была падпісаная М.П. Ар-

лову. З «салтыкоўкі» прыйшоў ліст з цытаваньнем урыўку ўспаміну Арлова, у якім ён згадваў гісторыю таго аўтографу. Дарэчы, М.П. Арлоў таксама быў пісьменьнікам і друкаваўся пад псэўданімам М.Севераў. Успаміны былі надрукаваныя ў парыскім часопісе «Красное знамя» (№2,1906). Вось гэты ўрывак: «...Мне случилось встретиться с Щедриным весною в редакции «Отечественных записок», помещавшейся на Спасской, в квартире секретаря редакции поэта А.Н.Плещеева. Щедрин был здоров и весел, рассказывал похождения героя Очищенного, не попавшие по цензурным условиям в только что вышедшую тогда «Современную идиллію». Тут же, вынув из конторки, он подарил мне экземпляр этой книги, сделав на нем любезную надпись...» Штосьці яшчэ пра лёс кнігі Анатолю Сысу не пашчасьціла дазнацца, а яго найперш цікавіла, якім чынам гэты том, падпісаны аўтарам, мог патрапіць у Беларусь.

Цяпер «Современные идилліи» мне нагадваюць і пра бібліятэку ДК ДРЭС, якой даўно няма, і пра Анатоля Сыса, якога таксама, на вялікі жаль, ужо няма сярод нас.

Не магу не прыгадаць пра апошні пэрыяд сваіх «дачыненьняў» з Домам культуры ДРЭС. Недзе з 15-ці гадоў, а можа і з 14-ці, мае аднаклясьнікі пачалі хадзіць туды на танцы. Але я ня быў такім раньнім, ня маючы ні адпаведнага росту, ні адпаведнага досьведу й сьмеласьці; таму дрэсаўскія танцы доўгі час абыходзіліся безь мяне. Пасьля восьмай клясы я паступіў у Жодзінскі політэхнікум, але з асобнымі школьнымі сябрамі сувязі не губляў, хаця ў мяне зьявіліся новыя — тэхнікумаўскія. Ясна, што школьныя сябры пачалі запрашаць мяне далучацца да паходаў на дыскатэку. Хадзіць пачаў, але піць разам зь імі таннае «пладова-ягаднае» віно, або інакш «чарніла», адмаўляўся. П’яная тупасьць мяне раздражняла, і гэты стан я проста ненавідзеў. Танцы ў ДК ДРЭС тады заўсёды былі пад жывую музыку мясцовага ВІА. Ня ведаю, як ён называўся і ці меў увогуле якую-кольвечы назву. Гралі хлопцы пераважна савецкія й замежныя хіты таго часу. Бубначом

быў Пурзік, Саша Пузанкевіч. Мы зь ім жылі ў суседніх дамах, і ён быў маладзейшы за мяне на год.

У залі паўзмрок. Гучаць першыя акорды. Перамагаеш ці то страх, ці то нейкі сорам. Чакаеш, пакуль зьявяцца ў цэнтры залі першыя пяць-шэсьць параў. Затрымлівацца нельга, бо вызначаную дзяўчыну могуць запрасіць у цябе перад носам. Ідзеш, запрашаеш, выходзіце разам у цэнтар, адчуваеш далонямі цяпло дзявочага цела, пачынаеш няўклюдна таптацца, час ад часу квола дакранаесься грудзінай да дзявочых грудак. Ад гэтых дотыкаў уздрыгваеш усім целам. Ніколі ня быў добрым танцорам. І, бадай што, не аматар танцаваць. Але на тых танцах у ДК ДРЭС цягне пабываць яшчэ раз.

## 3

Унутры Дому культуры можна было пабачыць звыклую савецкую агітацыйную аздобу: партрэты правадыроў, кумачовыя лёзунгі й цытаты з матэрыялаў чарговых зьездаў КПСС. Усё як у звычайных савецкіх культурных установах. Але было адрозьненьне. З тае нагоды, што ДК належыў энэргетыкам, тут ніколі не забывалі на ленінскі плян ГОЭЛРО. Гэтае дзіўнае слова заўсёды траплялася мне на вочы з розных плякатаў і транспарантаў. І зь дзяцінства неаднойчы чытаў па складах: «Камунізм — гэта ёсьць савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны». І толькі ў старэйшых клясах я даведаўся, што азначае рэбусавае спалучэньне літараў. Аднак да сёньня слова тое ў мяне асацыюецца ня з плянамі бальшавіцкага перайначваньня сьвету, а з Домам культуры на беразе невялікай рачулкі.

Акрамя бібліятэкі, у ДК я наведваў яшчэ два гурткі: краязнаўчы і клюб калекцыянэраў. Абодва гэтыя заняткі мне блізкія да сёньня. Мяне й цяпер пэрыядычна ахоплівае жарсьць калекцыянаваньня — марак, манэтаў, старажытных артэфактаў, кніг. З краязнаўствам таксама не разьвітваюся; балазе, мае журналісцкія й пісьменьніцкія заняткі таму спрыяюць.

Нашым дзіцячым гуртком краязнаўцаў кіравала Валянціна Крукава. Разам зь ёй мы імкнуліся разгадаць загадку зьяўленьня назвы Жодзіна. Легенды пра стрэлачніка-француза Жардэна, які нібыта пасяліўся ў гэтых мясьцінах і даў імя мястэчку, і пра рачулку Жодзінку, якая ўпадае непадалёк ад кінатэатра «Юность» у Плісу, мы ведалі з малых гадоў. Гэта ўжо напачатку XXI стагоддзя гісторыкі адшукалі ў архівах матэрыялы пра паселішча Багуслаў Поле, заснаванае князем Багуславам Радзівілам на беразе Плісы, якія пралілі сьвятло на сапраўдную гісторыю майго гораду. А ў далёкіх 70-х летапіс Жодзіна пачынаўся з будаўніцтва заводу БелАЗ.

## 4

Ужо калі вучыўся ў Менску ў наргасе, прыехаў неяк у родны горад са сваёй дзяўчынай. Увечары мы ўдвух гулялі па пасёлку ДРЭС і я ўголас фантазіраваў: стану вядомым пісьменьнікам, зараблю шмат грошай, выдаткую патрэбную суму на рэстаўрацыю тутэйшых вулачак і дамоў. Будзе супэрэлітны пасёлак пад чырвонай дахоўкай. Падарунак землякам. Мы сьмяяліся й верылі ў фантазіі. Зразумела, на месцы помніка Леніну мусіць стаяць мой бронзавы бюст. Вуліца майго імя і ў школе мэмарыяльны куток. І абавязкова парта, за якой сядзеў. Згадка пра парту выклікала ў нас гамэрычны рогат. Бо парты, на якіх сядзелі героі другой сусьветнай вайны, чамусьці заўсёды захоўваліся ў цалюткім стане, нават калі школы і цэлыя гарады ператвараліся ў руіны. У маёй СШ №1 імя Пятра Купрыянава за часамі майго дзяцінства таксама была парта героя. Хоць сам Пётр ніколі ў той школе і не вучыўся, бо яе пабудавалі ў пачатку 50-х гадоў.

Мы так і не прыйшлі да згоды адносна таго, што зрабіць зь нерэнтабельным Домам культуры. Для музэю задужа вялікі. Ніякіх матэрыялаў ня хопіць, нават калі б адшукаліся ўсе мае вучнёўскія сшыткі. Прагучала прапанова заснаваць культур-бізнэс-цэнтар, дзе штогод бу-

дуць ладзіцца міжнародныя аркушаўскія чытаньні. Але яе адкінулі з-за празьмернага марнатраўства.

Мы стаялі на прыступках ДК, і я распавядаў пра гэтую тутэйшую знакамітасьць. Пра бібліятэку, дзе былі кнігі зь яцямі, пра дзяўчат на танцах, за самых прыгожых можна было атрымаць паміж вачэй ад мясцовых «каралёў», пра ансамбль, які сьпяваў песьні бітлоў у расейскім перакладзе, а яшчэ залаты хіт Shocking Blue Шызгары: «Венера, голубая Венера...». Я пракрычаў радкі песьні ў набрыньваючы змрок, і рэха паміж псэўдарымскімі калёнамі адгукнулася мне знаёмым маладым голасам.

*03-05.03.2007*

* * *

зь дзяцінства ня меў
якіх-кольвечы здольнасьцяў
да музыкі
таму ў суседзкі ДК ДРЭС
які дасюль месьціцца
на стромкім беразе Плісы
хадзіў зь дзьвюх нагодаў

на танцы
або ў клюб калекцыянэраў

танцор у выніку зь мяне
ня выйшаў
а калекцыянэрам застаўся
на ўсё жыцьцё

зьбіраю
познанкі імгненьняў
значкі гісторыі
і манэты ўнікнёнасьці

* * *

сябар-аднаклясьнік
запрасіў да сябе ў госьці

сядзім ля става на лавачцы
і згадваем маладосьць

побач Пліса гайдае на сваіх хвалях
белатварыя лілеі
а за ракой
пачынаецца знаёмы лясок —
зялёным пасам ён выцягнуўся ў бок
карпусоў піянэрлягеру
у якім штолета ты бавіў
вольны час свайго дзяцінства

ці растуць зараз у тым ляску
суніцы?

ці грэюцца на іглістых сьцежках
яшчаркі?

ці хаваюцца пад маладымі елачкамі
сямейкі масьлякоў?

ці варта ўсё гэта спраўджваць?

# БАЛОТНАЯ РАКА

Беларускія гісторыкі сьцьвярджаюць, што засяленьне Беларусі адбывалася па берагах рэк. Спачатку былі засвоеныя вялікія рэкі, такія як Дняпро, Дзьвіна, Нёман, Прыпяць, Сож, Буг, Бярэзіна. На берагах гэтых водных артэрыяў паўсталі першыя тутэйшыя гарады: Полацак, Тураў, Віцебск, Магілёў, Горадня, Пінск, Гомель, Берасьце, Барысаў.

Але і меншыя рачулкі не засталіся па-за ўвагаю. Сярод іх і Пліса, правы прыток Бярэзіны. Пойма Плісы была заселеная з даўніх часоў. Аб гэтым сьведчаць археалягічныя помнікі. У газэце «Гоман Барысаўшчыны» (№9, 2007) Алесь Барэвіч напісаў пра існаваньне трох старажытных гарадзішчаў, якія да сёньня можна пабачыць на правым беразе Плісы, непадалёк ад яе вусьця. Вось як краязнаўца апісвае адно зь іх: *«На ім добра і выразна прасочваецца пляцоўка і штучнасьць зробленага ўмацаваньня з боку поймы. З напольнага боку роў не захаваўся. Месцамі прасочваюцца толькі яго рэшткі. Цікавым у гэтым гарадзішчы зьяўляецца тое, што з напольнага боку выразна прасочваюцца рэшткі калісьці магутнага вала. Прычым, яго разьмяшчэньне, нехарактэрнае для пляніроўкі такіх валоў гарадзішчаў, паказвае на тое, што ён быў зроблены значна пазьней за гарадзішча, калі яго пасяленьне пачало разрастацца і істотна выйшла за межы першапачатковай умацаванай пляцоўкі. Вал разьмешчаны не паралельна пойме Плісы, а, хутчэй, паралельна пойме Бярэзіны, што само па сабе вельмі красамоўна сьведчыць пра абарончыя прыярытэты пасяленьня»*.

На жаль, гэтае гарадзішча яшчэ не дасьледавана археолягамі, таму невядома, у які час яно паўстала і хто жыў у тым невядомым горадзе. Магчыма, гэта адно з абарончых паселішчаў, якія крывічы ўзводзілі на межах

сваіх уладаньняў. Адсутнасьць летапісных сьведчаньняў пра зьніклы горад, што меў абарончыя валы й равы (а такія ўмацаваньні не маглі збудаваць жыхары невялікага паселішча), гаворыць аб тым, што паўстаў невядомы горад не пазьней за IX-X стст. Бо ад часоў кіраваньня Полацкім княствам Рагвалода маем больш-менш дакладныя зьвесткі пра асноўныя населеныя пункты крывіцкай дзяржавы.

Наяўнасьць старажытнага гораду ў вусьці Плісы адназначна сьведчыць пра тое, што і ўся пойма гэтай невялікай ракі, якая цякла між глухіх лясоў і балотаў, была заселеная. Тое, што людзі жылі з даўніх часоў на берагах Плісы, яшчэ напрыканцы 70-х гадоў даказаў вядомы гісторык і археоляг Міхась Ткачоў, які знайшоў рэшткі селішча эпохі раньняга жалеза на правым высокім беразе Плісы, непадалёк ад сёньняшняй Смалявіцкай ДРЭС. На жаль, падчас будоўлі электрастанцыі й вадасховішча археалягічны помнік быў зьнішчаны. Ткачоў таксама адкрыў і невялікае паселішча XII—XIII стст. у вусьці рачулкі Жодзінка. Такім чынам, гісторыя Жодзіна значна больш старажытная за 1643 год, калі князь Багуслаў Радзівіл заснаваў у гэтых мясьцінах горад — Багуслаў Поле. Наўрад ці атрымаецца даведацца пра Жодзіна часоў Полацкага княства зь якіх-кольвечы летапісных сьведчаньняў (адзінае, калі здарыцца цуд: адшукаецца Полацкі летапіс), але ўжо сёньня на некаторыя пытаньні могуць знайсьці адказы археолягі. Першыя пошукі адразу прынесьлі цікавыя знаходкі. 10 чэрвеня 2008 году на беразе Плісы непадалёк ад прафілякторыя жодзінскага швейнага прадпрыемства «Сьвітанак», блізу вёскі Дымкаўка, падчас раскопак тамтэйшых курганаў было знойдзена пахаваньне XI—XII стст. Археалягічнае дасьледваньне адбывалася пад кіраўніцтвам супрацоўніка Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі Андрэя Вайцэховіча. Былі знойдзеныя парэшткі двух чалавек, якія жылі ў часы Полацкага княства. Папярэдні антрапалягічны аналіз засьведчыў, што гэта былі маладыя людзі, якія, магчыма, загінулі ў выніку трагічных падзеяў. Неўзабаве, спадзяюся, атрымаем адказ на вельмі цікавае пытаньне: да якой культуры і якога

племені належылі людзі, што жылі ў XI—XII стст. на берагах Плісы? Толькі руплівым і працавітым старажытнае Жодзіна будзе прыадчыняць свае таямніцы.

Але вернемся да самой рэчкі Пліса. Назва яе паходзіць ад балцкага слова «балота», і азначае «балотная рака». Да сёньня некаторыя берагі Плісы досыць багністыя, хаця за апошнія паўстагодзьдзя з-за мэліярацыі выгляд ракі значна зьмяніўся. Балотаў вакол Плісы істотна паменела, што адбілася на яе паўнаводнасьці. Да таго ж, частка ракі ад вытоку да вёскі Яловіца была каналізаваная — русла выпраўлена й ператворана ў раўнюткую мэліярацыйную канаву.

У Плісу ўпадае некалькі невялічкіх рачулак, галоўная зь якіх Чарніца, а таксама шэраг мэліярацыйных каналаў. Досыць паўнаводны цэнтральны мэліярацыйны канал, што зьбірае ваду ў раёне возера Судабле, упадае ў Плісу побач зь дзіцячым лягерам адпачынку жодзінскіх энэргетыкаў «Чайка». Некаторыя прытокі Плісы зьніклі проста на вачах. Зь дзяцінства памятаю, што паміж Смалявіцкай ДРЭС і садаводчым таварыстам бруіў ручай, які браў выток у балотах, што пачыналіся на ўскрайку пасёлку ДРЭС. Ад тых балотаў не засталося й сьледу. А яшчэ ў сярэдзіне 60-х я лавіў трытонаў і апалёнікаў сярод балотных купінаў непадалёк ад агароджы СмалДРЭС. Памятаю, увесну той ручай быў досыць паўнаводным, хаця ўжо летам перасыхаў. Цяпер аб ім нагадвае хіба толькі лоўж, па якім працякаў ручай. На вачах драбнее і легендарная рачулка Жодзінка, якая дала назву гораду Жодзіна. Цяпер гэта невялікі ручай.

Зь істотных зьменаў варта назваць і пабудову двух вадасховішчаў на Плісе — Смалявіцкага й Жодзінскага. Даўжыня Жодзінскага вадасховішча 3,5 кілямэтры. Створана яно было ў 1959 годзе для патрэбаў ДРЭС. На ім ёсьць некалькі невялікіх выспаў. Берагі вадасховішча, бадай, галоўнае месца адпачынку жодзінцаў. Тут месьціцца таксама дзіцячая спартовая база вясьлярства.

Дзесяць стагодзьдзяў таму, без сумненьня, Пліса была больш паўнаводная. Прынамсі, на чоўнах па ёй плавалі і

перавозілі грузы. А таксама сплаўлялі лес. Рака была багатая на рыбу, і людзі, якія жылі на яе берагах, заўжды займаліся рыбалоўствам. Насельнікі вёсак, што месьціліся ля ракі, плацілі падатак, сярод іншага, і рыбай. Нават падчас Другой усясьветнай вайны немцы загадвалі сяльчанам зь вёсак Яловіца, Трубянок і Прыбор'е лавіць рыбу для патрэбаў акупантаў, нават устанаўлівалі норму: па 20 кіляграмаў рыбы зь вёскі.

Плённа рака працавала і як млынар, круцячы жорны вадзяных млыноў. З гістарычных крыніцаў ведаем, што ў Жодзіне ў XVII стагодзьдзі былі два млыны: адзін на Плісе, другі на Жодзінцы. Пліскі млын пабудаваў у 1663 годзе Хома Каршэцэвіч. У 1665 годзе іншы заможны месьціч Алесь Іваськовіч за ўласны кошт паставіў млын на рачулцы Жодзінка. Тое, што на Жодзінцы магчыма было пабудаваць млын, сьведчыць аб тым, што рачулка ў той час была імклівай, «гаварлівай». Аб гэтым сьведчыць і назва: з балцкага «жодзіс» перакладаецца як «слова».

Быў млын на Плісе і ў вёсцы Ўпірэвічы. Гэтая вёска месьціцца бліжэй да вусьця. Млын працаваў да пачатку мінулага стагодзьдзя. Краязнавец Міхась Мацельскі высьветліў («Гоман Барысаўшчыны», №11, 2004), што у савецкі час той млын быў разабраны й перавезены ў Гару на месца, дзе раней быў іншы млын. На жаль, колькі гадоў таму млын гэты ў Гары быў зьнішчаны. Быў млын на Плісе і ў саміх Смалявічах.

Ну, бадай, і самае відавочнае: Пліса зьяўляецца эстэтычнай каштоўнасьцю. Найбольш маляўнічыя мясьціны Жодзіна — гэта абалона ракі ля пасёлку ДРЭС. Гэты куток гораду яшчэ патрабуе гаспадарлівага ўпарадкаваньня. Але ўжо сёньня мясьціну тую ўпадабалі прыхільнікі рыцарскага руху. У 2007 годзе яны наладзілі на беразе Плісы рыцарскі фэст, які, магчыма, стане традыцыйным.

*15.06.2008*

# БРЫЗГАЛАЎКА

## 1

Ні ў адной беларускай энцыкляпэдыі не пазначана, што ў Беларусі ў 60-х гадах існаваў адкрыты басэйн зь цёплай вадой, які не замярзаў у самыя лютыя маразы. А такі басэйн быў насамрэч. Знаходзіўся ён у Жодзіне.

Паўстаў басэйн наступным чынам. Па вайне на беразе невялічкай рачулкі Пліса ў Смалявіцкім раёне пачалі будаваць ДРЭС. Для цеплавой электрастанцыі патрэбна шмат вады, таму вырашылі стварыць побач вадасховішча. Плісу запрудзілі, для рэгуляваньня стоку вады ўзьвялі плаціну са шлюзамі. Дарэчы, гэтая плаціна, як і само вадасховішча, і цяпер адна з галоўных славутасьцяў Жодзіна. 30 лістапада 1951 году станцыя дала першы ток. На той час горад яшчэ толькі пачаў будавацца, а рабіць цэнтральнае ацяпленьне прыватных дамоў аўтэхтонаў было непад'ёмнай раскошай. Узьнікала пытаньне: куды дзяваць лішкі гарачай вады? Варта патлумачыць, што вада тая чыстая, можна сказаць, дысцыляваная, — гэта кандэнсат пары — той самай, што круціць турбіны. Ваду пачалі зьліваць у вадасховішча. Ня проста банальна зь нейкай аграмаднай трубы, абы пазбыцца. Працэс вяртаньня адпрацаванай $H_2O$ арганізавалі згодна нейкіх галіновых правілаў і нормаў. Пасярод вадасховішча паўстала вялікая канструкцыя з трубаў у стылі лепшых узораў эстэтыкі канструктывізму. Вада лілася ў вадасховішча зь некалькіх сотняў соплаўвадаліваў, ствараючы адмысловы канструктывісцкі малюнак з пырскаў і струменяў. Акрамя малюнку, трубы нараджалі музыку, гукі якой луналі над навакольлем, як рокат вадаспаду. І самае прыгожае — над вадаліўным цудам увесь час луналі зыркія вясёлкі.

Народ празваў усё гэта брызгалаўкай. Правы бераг вадасховішча знаходзіўся «пад пратэктаратам» ДРЭСу, ля нашага берагу і месьціўся плісскі Пецяргоф. З часам брызгалаўкай сталі зваць усю прылеглую да вадаліваў тэрыторыю вадасховішча.

Дык вось, побач з тым водным «калярыфэрам» пабудавалі драўляны адкрыты басэйн. Купацца ў ім можна было практычна ўсе чатыры пары году. Сёньня, напэўна, мала хто памятае з маіх землякоў, што ў 60-70 гады ў Жодзіне, з нагоды наяўнасьці шыкоўнай воднаспартовай базы, было вельмі папулярным воднае пола. Горад нават меў моцную каманду, якая ўдзельнічала ў гульнях чэмпіянату Беларусі. Касьцяк каманды складалі старшаклясьнікі нашай дрэсаўскай СШ №1. І, зразумела, яшчэ ў тыя брызгалаўскія часы нарадзілася мясцовая школа веславаньня.

## 2

Калі зімой улюбёным месцам гульняў і забаваў дрэсаўскай дзятвы была горка ля Дому культуры, дык летам, няцяжка здагадацца, культавым месцам была брызгалаўка. Тут мы прападалі днямі, а часам і суткамі. Загаралі, купаліся, лавілі рыбу, займаліся спортам, прызначалі спатканьні. Брызгалаўка была ўмоўна падзеленая на сэктары. Адразу за плацінай пачынаўся агульнагарадскі пляж з пляцоўкай для купаньня дзятвы, так званы «лягушатнік». Далей, побач з басэйнам, адпачывалі спартоўцы й гарадскія «аўтарытэты». Было шмат аматараў загараць на драўляных кладках прымітыўнага спартовага аб’екта. А яшчэ далей, побач з дрэсаўскай паліклінікай, пачыналіся любімыя мясьціны гарадской дзятвы. Бераг тут пясчаны, старэйшым жодзінцам зручней загараць на траўцы, а для малалеткаў гарачы бялюткі пясок — дадатковая забава. Купаліся да замарачэньня, а затым дурэлі на пяску, — качаліся, абсыпаліся й зноў у ваду.

Непадалёк ад пляжу знаходзілася яшчэ адно славутае месца — бурлілка. Поруч з дзьвюма таўшчэзнымі трубамі, па якіх паступала вада ў брызгалаўку, ішла яшчэ адна вялікая труба, якая, пад прамым вуглом давала нырца ў вадаём. Па ёй таксама цякла цёплая вада, але гэта быў страхаваны зьліў, — калі ціск ва ўсёй сыстэме падымаўся да небясьпечнага ўзроўню, лішкі $H_2O$ адводзіліся сюды. Вакол трубы вада ўвесь час бурліла, таму месца тое празвалі бурлілка. Звычайна труба была запоўненая на траціну, а то й меней. Занырваньне ў гэты мэталічны грот было любімым заняткам дрэсаўскай дзятвы. Вось купаюцца некалькі хлопцаў, затым даюць нырца і зьнікаюць. Пяць хвілінаў мінае, дзесяць, а іх няма. Яны ў трубе.

Быў у нас яшчэ адзін любімы занятак — катацца на лодках. На супрацьлеглым беразе месьцілася лодачная станцыя. У бацькоў бралі пашпарт, або ў заклад хтосьці аддаваў свой гадзіньнік, яшчэ адзін абавязкова мусілі браць з сабой — пільнаваць час. Гадзіна карыстаньня лодкай каштавала 15 капеек. Зьбіралі каманды па два-тры чалавекі на борт і рабілі вандроўкі за судабоўскі мост, дзе вадасховішча зьнікала ў зарослых аерам затоках. Я любіў грэбсьці, і ў мяне гэта някепска атрымлівалася. Па дарозе наведвалі дзьве маленькія выспы. Кожны раз, пры высадцы, песьцілі надзею нешта на тых выспах адшукаць. Але акрамя чалавечых экскрэмэнтаў нічога не знаходзілі.

## 3

Тое, што на месцы дрэсаўскай паліклінікі некалі знаходзілася старое паселішча ранняга жалезнага веку, у свой час адкрыў вядомы археоляг Міхась Ткачоў. У 60-х ён чатыры гады жыў у Жодзіне і выкладаў гісторыю ў СШ №3.

Ткачоў выявіў побач з паліклінікай, на беразе Плісы, зьнішчаны будоўляй культурны слой. Афіцыйна гэта нідзе не было зафіксавана (ані публікацыяў, ані навуковай справаздачы), і таму сёньня ўспрымаецца як гіпотэза,

пацьвярджаць якую ніхто не сьпяшаецца. Маўляў, няма доказаў. Адзін доказ я меў уласны. У дзяцінстве побач з палікклінікай мне пашчасьціла знайсьці прасьніцу. Пазьней падобныя артэфакты неаднойчы знаходзіў у Полацку. На жаль, тую жодзінскую прасьніцу я памяняў на «вэкээлаўскую» манэтку-солід, калі адпачываў у піянерскім лягеры. Зараз шкадую. Бо месца той прасьніцы — у новастворанымжодзінскім краязнаўчым музэі.

*06-08.03.2007*

# НА РЫБАЛКУ НА ФАНТАНЫ

Гэта называлася —ісьці на рыбалку на фантаны. Просіш зь вечару маці, каб пабудзіла на сьвітанку. Лёгкі сьнеданак, пару бутарбродаў у бідончык — і шыбуеш па яшчэ не абуджаным ДРЭСе на брызгалаўку. У руках бамбукавая трохкаленка і традыцыйны плястмасавы бідончык. Яшчэ золка, бо першыя промні сонца толькі дакрануліся да зямлі і не пасьпелі яе, астыўшую за ноч, нагрэць. Ты курчысься і прысьпешваш крок, каб сагрэцца. Вось і *домохра* засталося ззаду. (Так дрэсаўцы называлі два дамы-інтэрнаты, што стаяць побач з прахадной ДРЭС, у іх жылі некалі ахоўнікі станцыі — «дом охраны».) Выходзіш на бераг вадасховішча. Гул ад струменяў і пырскаў, якія нястомна, дзень і ноч, фантануюць у вадасховішча з сотняў соплаў і труб, чутны яшчэ ад дарогі на Судабоўку, асабліва ў такі ціхі раньні час. Ты да яго прывык, як да цік-таканьня насьценнага гадзіньніка ў гасьцёвым пакоі тваёй кватэры.

Выходзіш да месца, дзе вялікія трубы адрываюцца ад зямлі і на адмысловых бэтонных палях над вадой ідуць па вадасховішчы ў бок плаціны. Звычайна на фантаны абуваеш кеды, каб не было сьлізка хадзіць па трубе. На рацэ ўжо няма той золкасьці, якая падганяла цябе па дарозе. Брызгалаўка выпраменьвае цяпло, ды й самі трубы цёплыя — кладзіся, абдымай рукамі і грэйся. Гэта, калі няма чаго рабіць. А мы ідзем на рыбалку. Наперадзе загароджа з мэталічных прутоў і надпіс: «Па трубах не хадзіць». Але на забарону ніхто не зьвяртае ўвагі, нават дзеці. Звыклымі рухамі абмінаеш загароджу і выходзіш на апэратыўны прасьцяг.

У кожнага дрэсаўскага хлопца ёсьць на фантанах сваё ўлюбёнае месца, прыкормленае, да якога прызвычаіўся. Спаўзаеш уніз на меньшую трубу-адгалінаваньне, сядаеш як зручней, прывязваеш вяроўчынай ці алюміневым

babdротам бідончык да якой жалязячыны, якіх тут вакол хапае, і пачынаеш наладжваць сваю вуду. Абавязкова жуеш корку хлеба і мякішам падкармліваеш сваё месца.

Паплавок у тваёй снасьці мусіць быць зь пяра з чырвоным надвершам. Якісь іншы тут цяжка заўважыць, а галоўнае, незразумела, калі клюе. Вада вакол кіпіць і пеніцца ад пырскаў. Гул стаіць такі, што разамаўляць практычна немагчыма, таму, калі ідзеш на фантаны зь кімсьці, то размаўляеце рухамі рук, як глуханямыя.

На фатанах ловіцца пераважна плотка, зрэдку трапляе карась. Ловім на хлеб. Лепш, канешне, на матыля, але дзе яго ўзяць? Дзядзькі за матылём езьдзяць на гарадзкія ачасныя. Не, нам мальцам добра й на хлеб.

Вось паплавок зьнік пад рабаціньнем вады. Падсякаеш, і рукі раней за галаву разумеюць: ёсьць! Вось і першая платвічка. Ладненькая. Больш чым з далоньку. Цельца рыбы шчодра пакрыта сьлізьзю, і таму трэба асьцярожна здымаць здабычу з кручка, інакш упусьціш; бадай, толькі лін больш сьлізкі за платву. Рыбу кідаеш у бідончык, рукі выціраеш аб кашулю ці штаны. Клёў як мае быць! І ўвесь аддаесься рыбалоўнаму азарту.

А сонца ўсё вышэй і вышэй уздымаецца над галавой. Вось ужо й горача робіцца ад яго дотыку. Рыба перастае кляваць нечакана й абсалютна — як адрэзала. Далей сядзець на трубе ня мае ніякага сэнсу.

Вяртаесься дадому крыху стомлены. Усё ж сядзець на трубе ня вельмі зручна, цела зацякае — не пабегаеш, не папрысядаеш. У руках бідончык з уловам. Сустрэчныя хлопцы зазіраюць у тваю ёмістасьць. Хваляць. Ля самага пад’езду сустракаеш свайго суседа Паўліка. Ён таксама цікавіцца ўловам. «Нічога так платвічкі. На фантанах лавіў? Заўтра і мне трэба схадзіць. Мо пойдзем разам?» «Пойдзем. Дамовіліся.»

*15.12.2007*

# ПЛАЦІНА

Плаціну ўзводзяць для таго, каб кіраваць ракою. Як ні дзіўна, прыдумаў гэтае гідралягічнае збудаваньне не чалавек, а жывёла, дакладней, бабёр. Трэба меркаваць, баброў некалі ў Плісе было шмат, і будавалі яны свае плаціны ў ваколіцах Жодзіна шматкроць. Ня ведаю, як зараз, але за часамі майго дзяцінства бабра можна было пабачыць нават у межах гораду; прынамсі, я назіраў гэтага зубатага будаўніка ў Плісе побач з ДК ДРЭС. Калёнія баброў жыла ў вялікім мэліярацыйным канале, непадалёк ад піянерлягера «Чайка». Дарэчы, на тым канале я на свае вочы бачыў плаціну, пабудаваную бабрамі.

Але *гэтую* плаціну збудавалі не бабры. Яна з бэтону й мэталу. А значыць — тварэньне чалавека. Дзякуючы ёй і паўстала жодзінскае вадасховішча на Плісе. У дзяцінстве плаціна была маім самым магнэтычным месцам — да яе прыцягвала; назіраць імклівы, гучны спад вады я мог гадзінамі. Асабліва цікавае відовішча можна было назіраць тут увесну, калі ўзровень вады ў вадаёме падчас падводкі ўзьнімаўся і яна шалёным наступам атакавала плаціну. Гледзячы на дзікі, з аглушальным рокатам, спад вады, перанітаваны вясёлкамі, я дзівіўся: якой сілай валодае гэтая спакойная й лагодная на дотык вада; і вось жа «зацугляў» яе чалавек, а гэты шал — толькі дэманстрацыя сілы; гэтак жа дэманструе яе гарачы скакун, які ўдае, што не згубіў свой дзікі нораў. І плаціна паўставала для мяне ў вобразе асілка, які ўтаймовае вадзянога цмока. І гэты вобраз мне надзвычай падабаўся. Праўда, падабаўся ён і савецкай уладзе, якая выкарыстоўвала маю плаціну ў ідэалягічных мэтах. На ёй заўсёды былі напісаныя савецкія лёзунгі. Месца для надпісу было няшмат, дык звычайна ён быў ляканічны: «Слава КПСС» або «Міру мір». Апошні лё-

зунг зьяўляўся часьцей, падазраю, з тае прычыны, што ў ім на дзьве літары менш.

Мая плаціна выконвае яшчэ адну важную ролю — маста, праз які едуць машыны, ідуць пешаходы. Гэты мост злучае пасёлак ДРЭС зь іншай часткаю гораду, і, такім чынам, яго можна назваць найважнейшым мясцовым камунікацыйным аб'ектам. З моста цікава назіраць за плыньню ракі, асабліва летам у сонечны дзень. За маім дзяцінствам рака была шырэйшая, глыбейшая й чысьцейшая. На каменным перакаце на страмніне заўсёды гойсалі стайкі ўклеек — невялікіх вузенькіх рыбак, якія звычайна трымаюцца ля паверхні ракі ў пошуку жамяры, што трапляе ў ваду. Сярод іх, як цені субмарынаў, амаль стаялі на адным месцы цельцы больш вялікіх рыбаў. Гэта галаўні, надзвычай прыгожыя й імклівыя рыбы. Яны таксама харчуюцца насякомымі з паверхні ракі, але, у адрозьненьні ад уклеек, палююць на вялікую здабычу — травеньскіх жукоў, стракозаў, матылёў.

Дарэчы, плаціна была ўлюбёным месцам тамтэйшых вудалёў; часам, у які пагодны дзень, яны з раніцы займалі тут месцы і можна было налічыць іх на мосьце й вакол яго зь дзясятак і болей. Няцяжка было ля самой плаціны злавіць і рака. Некалькі разоў назіраў, як больш дарослыя хлопцы, у ластах і масцы, ныралі адразу пад мостам і лавілі клешняногіх. Але мне запомнілася адна свая ўласная рыбалка. Ня памятаю, які гэта быў год. Недзе першая палова 70-х. На рыбалку я пайшоў з бацькам. Неаднойчы, праходзячы праз мост, мы зь ім спыняліся й назіралі за галаўнямі. На звычайную вуду іх цяжка было злавіць, бо рыбы не падпускалі блізка, і нават асьцярожныя рухі вудай іх адразу адпужвалі. Бацька сказаў, што тут патрэбны сьпінінг. Аднойчы ён папрасіў мяне налавіць стракозаў, травеньскіх жукоў, аваднёў, конікаў. Пад вечар справа была зроблена — некалькі скрыначак ад запалак былі поўныя насякомымі. Мы ўсталі рана. Плаціна нас сустрэла сяброўскім вітаньнем — рокатам вады й вясёлкамі паміж пырскаў. Бацька зьняў са снасьці грузіла, каб яно не тапіла прынаду, пакінуўшы паплывок і кручок. Ён стаў

пасярэдзіне маста і па плыні пачаў пускаць сваю снасьць. Першы галавень быў у нашым вядзерцы ўжо праз хвілін 10. Праўда, далей справа пайшла не зусім гладка. Нярэдка ў рыбы атрымлівалася сьцягнуць прынаду з кручка беспакарана. Хутка высьветлілася, што да такой рыбалкі найлепш падыходзяць вялікія мухі і авадні, на якіх я неадкладна пачаў паляваньне. Травеньскіх жукоў рыба адразу не заглытвала, а толькі тапіла, яны хутка намакалі й рабіліся непрыдатнымі для лоўлі. Стракоз галаўні налаўчыліся лёгка здымаць з кручка.

Рыбалка атрымалася азартнай і відовішчнай. Цікава было назіраць, як рыба атакавала прынаду, як змагалася, калі патрапляла на кручок. Але, насамрэч, гэтая рыбалка запомнілася зь іншай нагоды. У той дзень я ўпусьціў самага вялікага злоўленага галаўня. Я захацеў абмыць яго ад пяску, панёс да ракі, і там ён высьлізнуў з маіх рук. Якая была трагедыя! Яшчэ некалькі год той выпадак згадваўся мне як самае вялікае ў сьвеце разявацтва.

Падчас рыбалкі на плаціне мы заўсёды хадзілі піць ваду да крыніцы, якая б'е крыху ніжэй моста. У 90-х гадах спэцыялісты вызначылі, што вада тут багатая на каштоўныя мінэралы. Пляцоўку вакол крыніцы добраўпарадкавалі: зрабілі бэтонныя сходы, для адпачынку паставілі лаўкі. Цяпер да нашай крыніцы езьдзяць жыхары ўсяго гораду.

А крыху далей за крыніцай, на другім павароце ракі, ёсьць яшчэ адно адметнае месца. З вады там можна пабачыць драўляныя п*а*лі, якія ідуць ад аднаго берага да другога. Тут раней быў вадзяны млын, пра які згадваецца яшчэ ў XVII стагодзьдзі ў рэестры Багуслава Поля. Некалі жодзінцы той млын адновяць. Няхай сабе для іншых патрэбаў. Напрыклад, каб зрабіць у тым млыне самую лепшую кавярню ў горадзе.

*7.03.2008*

* * *

у Жодзіне на мосьце
пад якім шуміць вадаспад
гляджу на гульню пырскаў

усплываюць відзежы
дзяцінства

трансьляцыя празь дзесяцігодзьдзі

Пліса ашчадна
(даражыць кожнай кропелькай)
коціць свае воды
у Бярэзіну

вадаспад як мытня
кожная кропелька
праходзіць агляд

недзе там унізе
пад замшэлым каменем
схаваўся мянтуз
з маім залатым кручком
у роце

* * *

прызначыў табе спатканьне
на брызгалаўцы
ля трэцяга фантану

табе

мая срэбная
платвічка

* * *

на Судабоўскім возеры
ў чаратах
схаваў з сябрамі
човен
і ніяк знайсьці не магу

шукаю ўжо сорак чатыры гады

бо ў тым чоўне
пакінуў свой
шчасьлівы рыбалоўны
кручок

а безь яго не шанцуе
хоць ты плач

# КАТАНЬНЕ НА ПЛЫЦЕ

Падчас паводкі ў 60-70-ых гадах за плацінай утваралася яшчэ адно вадасховішча — вада залівала ўсю пойму Плісы. У выніку паўставаў вялікі вадзяны прасьцяг, большы, чым штучны вадаём перад плацінай. Гэта было любімае для нас, дзятвы, відовішча. Асабліва прыгожа выглядаў веснавы краявід з горкі ля ДК ДРЭС. Шырыня разьліву сягала за 100 мэтраў, і вада стаяла ля самых платоў хат на супрацьлеглым беразе. Бачыў на свае вочы, як старэйшыя хлопцы рабілі плыты й каталіся па гэтым веснавым раздольлі. У мяне такой прыгоды не было, а, магчыма, я ня меў на яе адвагі. Затое побач з домам катаўся на плыце штовесну.

Першую палову 60-х гадоў мае бацькі жылі ў трохпавярховіку — два такія дамы былі пабудаваныя напачатку пасёлку ДРЭС як сымбалічная брама ў горад. Пасёлак ДРЭС праектавалі ў 50-х тыя ж ленінградзкія архітэктары, што і Менск, таму прыём «брамы ў горад» яны скарысталі і тут. Праўда, так пампэзна й багата, як ў Менску, зпраектаваць яны не маглі — ня той узровень. Таму дамы пабудавалі звычайныя, безь якіх-кольвечы аздобаў. Але трохпавярховых будынкаў больш у пасёлку на той час не было, і гэтыя выглядалі, сапраўды, як вежы. У левым будынку на першым паверсе была рэстарацыя (а затым крама «Обувь»), у правым — крама «Промтовары»: тут прадавалася вопратка, тканіны й галянтарэйныя тавары, менавіта тут жыхары пасёлку набывалі флякончыкі адэкалёну ў падарунак да 8 сакавіка.

У правым будынку, у якім была крама «Промтовары», на другім паверсе пачыналася маё жыцьцё. У чатырохпакаёвай кватэры жылі тры сям'і. Мы займалі два сумежныя пакоі, нашы вокны выходзілі наўпрост на электрастанцыю. Мой бацька працаваў машыністам котлатурбіннага цэху,

а маці ў хімлябараторыі станцыі. У гэтым доме я падрос і пайшоў у першую класу.

З тых гадоў больш за ўсё запомнілася менавіта катаньне на плыце. Далей за маім домам пачыналася пустка. Праўда, напачатку 60-х там яшчэ быў невялікі драўляны базарчык, але я ўжо ня памятаю, каб на ім што-кольвечы прадавалі. Відавочна, ён функцыянаваў у 50-х гадах. І яшчэ трохі далей і вышэй, на невялічкім узгорку — керасінавая будка. За часамі майго дзяцінства ўсю гэтую пустку за маім домам вясной залівала вада, утвараючы невялікае возера. Менавіта яно рабілася месцам галоўных забаваў навакольнай дзятвы.

У маім пад'ездзе жыла габрэйская сям'я вядомага ў Жодзіне жаночага цырульніка Гузбанда. Ён меў дзьвюх дачок і сына Юру. Дык вось, менавіта Юра прыдумаў рабіць штовесну плыт і катацца на ім. У маім трохпавярховіку знаходзілася кантора станцыйных электрыкаў, а за нашым дваром, побач з электрападстанцыяй, — іх майстэрня і склады. Тут звычайна й ляжалі драўляныя слупы для ліній электаперадач. З гэтых слупоў, з дапамогаю драта, Юра й рабіў плыт.

Час дашкольнай дзятвы на забаву быў з раніцы, пакуль старэйшыя хлопцы вучыліся ў школе. Прачыналіся, сьнедалі, апраналіся, абавязкова абувалі гумовыя боты і беглі, хто раней пасьпее, да плыта. Забава сапраўды атрымлівалася адмысловая. Часам плыт сядаў на меліну і трэба было сьцягнуць яго на глыбокае месца. Драматычнасьць сытуацыі палягала ў тым, што якраз вакол было глыбока і сухому дабрацца да берагу можна было толькі на плыце. Нярэдка нашых дзіцячых моцаў не хапала, каб сьцягнуць плыт зь меліны, і пацярпелыя аварыю былі вымушаны перапраўляцца на бераг па пояс у вадзе, на радасьць і забаву тым, хто назіраў за падзеяй з боку. Рогату было на ўсё навакольле. А табе не да сьмеху — выліўшы ваду з ботаў, мокры па вушы куляй ляціш дахаты. Добра, калі там няма нікога, калі бацькі на працы. Пераапранаесься і зноў на вуліцу. А інакш можна атрымаць папругі й веснавы дзень прасядзець у кватэры.

Старэйшыя хлопцы прыходзілі са школы, бачылі плот пасярод разьлівы, лаяліся на нас, пагражаючы больш ніколі не падпусьціць да плыта. Юра Гузбанд здымаў штаны й лез у ледзяную ваду здымаць плаўсродак зь меліны. І пад урачыстыя воклічы вяртаўся на ім да берага. Пагрозы старэйшлых хлопцаў хутка забываліся, ды й не маглі яны ад нас схаваць плыт. Праўда, нейкі час Юра спрабаваў прывязваць свой «карабель» да берагу сталёвым дротам. Але хутка тое яму надакучвала і плыт быў зноў у нашым ранішнім карыстаньні.

Летась дапамагаў брату будаваць дом ў Жодзіне, разгружалі на ДРЭСе дошкі. Падыйшоў Паша Іваноў, мой аднагодак, ён жыў у катэджы побач з маім трохпавярховікам. Былы сябар маіх дашкольных гадоў. Пачаліся роспыты: як ты, дзе ты? «А памятаеш, як вясною каталіся разам на плоце?» — спытаў я Пашу. «О, гэта тое, пра што я ўсім расказваю! Найперш дзецям сваім».

Даўно ўжо вясною тут не бывае нават калюжыны. На месцы нашага веснавога возера пабудавалі прыгожы, сучасны шматпавярховік. І толькі ў сьне, трымаючы вялікі шэст у руках, выпраўляюся час ад часу я ў катаньне на плыце, нясьпешна кіруючы свой карабель, як стары лоцман, па знаёмых да драбніц мясьцінах.

*11.03.2008*

# САНЧА І ПАНСА

Пра тое, што Дзіма Войтка мой малочны брат, я даведаўся пасьля таго, як зь ім пасябраваў. Ягоны бацька, таксама як мае тата й мама, працаваў на Смалявіцкай ДРЭС шэф-інжынэрам па рамонце паравых турбінаў. Мы былі карэннымі дрэсаўскімі мальцамі, да таго ж вучыліся ў адной клясе.

З чаго пачалося наша школьнае сяброўства, ўжо й ня помню. Напэўна, з музыкі. Абодва былі аматарамі заходняга року. Я выключна ў якасьці слухача, а Дзімыч, так яго называлі сябры, меў немалы музычны талент — добра іграў на гітары й лёгка падбіраў акорды да песень. У Дзімыча быў старэйшы брат, таксама вялікі аматар рок-музыкі, які на той час ужо сабраў вялікую фанатэку. А я меў стрыечнага брата, што вучыўся ў Менску і пэрыядычна прывозіў мне запісы, — на ягоным факультэце займалася багата замежных студэнтаў. У нас было чым абменьвацца і што перапісваць адзін у аднаго на свае бабінныя магнітафоны.

Дзімыч быў брунэтам і высокага росту. Я — русавалосы й на галаву ніжэйшы за сябра. Здаецца, менавіта мая маці і прыдумала нам калектыўную мянушку «Санча і Панса». Дзімычу гэта спадабалася, ён мяне так і зваў — Санча.

Я зьдзіўляўся, як лёгка Дзімыч падбіраў акорды, як складна выбудоўваў мэлёдыю. У шостай клясе бацькі купілі гітару і мне, пасьля чаго Дзімыч узяўся мяне музычна адукоўваць. Вучнем я аказаўся няздольным, далей некалькіх самых простых песенек справа не пайшла. Але Дзімыч не губляў надзею стварыць сяброўскі гурт. Пэрыядычна ў маёй кватэры, паклікаўшы з сабой яшчэ пару аднаклясьнікаў, мы наладжвалі сэйшаны. Замест барабанаў і талерак, прыстасоўвалі рондалі й патэльні. З музычных інструмэнтаў мелі толькі дзьве

гітары і дзіцячы ксыляфон. Аднойчы нават запісалі на магнітафон наш «дэбютны альбом». Памятаю, у той час усе гурты пры школах і ДК мелі у сваім рэпэртуары песьні пра Вялікую Айчынную вайну. З гэтай казёншчыны і неадпаведнасьці нашаму разуменьню рок-культуры мы абураліся і ўсяляк тое высьмейвалі. У выніку, самі напісалі песьню пра ВАВ. Рэфрэнам у ёй быў радок «немцы пад Барысавам, немцы пад Барысавам». Звычайна «школьныя і домкультурныя» калектывы сьпявалі пра подзьвіг савецкага народу, а мы сваю песьню прысьвяцілі першым дням вайны.

Насілі мы і адпаведныя фрызуры. Дзімыч, як лідэр нашага гурта, быў самы патлаты. У школе ўпарта, але беспасьпяхова спрабавалі пазбавіць хлопца ягоных смаляных кудзераў. Кантроль фрызураў звычайна адбываўся падчас урока, працы, калі хлопцы займаліся асобна ад дзяўчат. Нас вышнуроўвалі ў шыхт, і за хлапечымі сьпінамі клясны кіраўнік або завуч выносілі вэрдыкт, каму трэба ісьці ў цырульню. Дзімыча накіроўвалі ў першых шэрагах. Ён сыходзіў, але назаўтра зьяўляўся ў клясе ў сваім звыклым выглядзе. Выклікі бацькоў у школу дапамагалі слаба. Дзімыч згаджаўся толькі крыху абкарнаць свае бітлоўскія пасмы.

Пра тое, што Дзімыч мой малочны брат я даведаўся выпадкова. Неяк маці, трымаючы ў руках шкляны графін, на якім было напісана «40 год БССР», сказала, што гэта падарунак маці Дзімы. «Зь якой гэта нагоды?» — спытаў я. Нашы бацькі ніякіх сяброўскіх сувязяў не падтрымлівалі, таму прэзэнт выглядаў дзіўным. Мама й распавяла, што Дзіма нарадзіўся на дзень раней — 27 траўня. У ягонай маці хутка зьнікла малако, а ў маёй мамы заставалася — прыходзілася сцэджваць. Гэтыя лішкі й патраплялі Дзімычу. Тры месяцы мама дзялілася малаком. У выніку, як я пазьней жартаваў, мой сябар і вырас такім даўгалыгім! У знак удзячнасьці Дзімава маці падарыла маёй маме прыгожы графін.

Пасьля 8 клясы я паступіў у Жодзінскі палітэхнікум. У мяне зьявіліся новыя сябры, але Дзімыч заставаўся сярод

блізкіх мне людзей. Зь ім я хадзіў на танцы, па-ранейшаму слухаў музыку і ягонае брынчаньне на гітары.

У войска мы пайшлі ў адзін год — 1979-ы. Дзімыча забралі раней. Неяк зусім квола ўзгадваюцца ягоныя провады. Помню, што «разьвітальная каляцыя» ладзілася ў самым вялікім пакоі іхняй кватэры. У той час падобныя вечарыны колькасьцю гасьцей і багацьцем выпіўкі нагадвалі вясельле. Дзімыча на маіх провадах не было, ён тым часам праходзіў каранцін у Слуцку, а затым пачаў служыць у ракетным дывізіёне ў гарадзкім пасёлку Урэчча Любанскага раёну. Я ж патрапіў у вучэбку ў Печы, па сканчэньні якой служыў у Берасьці на памежнай вайсковай перавалачнай базе.

Падчас службы мы ліставаліся: пісалі пра свае праблемы, марылі пра «гражданку».

Але надалей ўсё адбылося далёка ня так, як марылася, прынамсі, у Дзімыча. Пасьля арміі нашыя жыцьцёвыя шляхі пайшлі рознымі каляінамі: я паступіў у наргас, Дзімыч пачаў працаваць на СмалДРЭС. Мой музычны настаўнік неўзабаве ажаніўся і пераехаў у Вуглы — аддалены ад пасёлку ДРЭС куточак Жодзіна. Мы пачалі бачыцца рэдка, практычна выпадкова. У Вуглах, дзе ён жыў у прымах, я, здаецца, быў усяго адзін раз.

Па сканчэньні наргаса я пераехаў на Полаччыну і нашыя сувязі канчаткова абарваліся. Весткі пра Дзімыча мне даходзілі праз маці, калі я наведваў бацькоўскі дом. Навіны былі сумнымі. Дзімыч пачаў выпіваць. Некалькі разоў я выпадкова сустрэў яго на ДРЭСе. Сябар быў нападпітку. Ад таго ранейшага энэргічнага, прыгожага Дзімыча мала чаго засталося. Агульнымі цяпер у нас былі хіба што ўспаміны пра мінулае.

Пасьля 40-годзьдзя ў Дзімыча пачалася чорная паласа. Татальна не шанцавала. Пазбавіўся працы на СмалДРЭС. Распалася сям'я. І самае страшнае: дачка загінула ў авіякатастрофе, ляцела на адпачынак тым самым самалётам, які пацярпеў аварыю над Бодэнскім возерам у Нямеччыне.

І зусім нечаканая навіна прыйшла ў 2008 годзе. Прыехаўшы на адпачынак да бацькоў у Жодзіна, ад маці

пачуў, што Дзімыча больш няма. Сэрца сябра спынілася ўвесну, калі пачала абуджацца прырода.

Дзіўным чынам захаваліся Дзімавы лісты, што ён пісаў мне ў войска. Іх роўна 20 штук. Першы ліст Дзімыч напісаў 3 чэрвеня 1979 году са Слуцку.

*«Прывітаньне, сябар Санча!*

*З горыччу сустрэў вестку, што і ты загрымеў на два гады. Насамрэч, ты слушна зрабіў, што сам напрасіўся, усё-такі ўсе разам прыйдзем. І як служба? Крыху ганяюць? Па-праўдзе, ты трапіў ня вельмі ўдала, але гэта фігня, два гады ўсё роўна трэба адбыць. А ў мяне служба перавваліла ўжо за месяц, пайшоў другі. Знаходжуся я па-ранейшаму ў Слуцку ў каранціне. (...)*

*Нас ужо разьмеркавалі па частках. Я трапіў ва Ўрэчча, гэта кілямэтраў сорак ад Слуцку. Служыць буду ў ракетным дывізіёне. Таксама, як бачыш, патрапіў няхіла. Я там ужо быў, нас вазілі на два дні на трывогу. Частка стаіць у лесе. Паганялі някепска. Паднялі па трывозе а 4-ай раніцы, пасадзілі ў машыны і завезьлі на палігон на цэлы дзень, там мы рылі акопы для ўстановак. Задалбаліся па-страшнаму. Сьпёка стаяла невыносная і камар'я хоць ж... еш. Увогуле нядурна. (...)*

*Ну а як ты там? Праз паўгода атрымаеш лычкі. А я буду ў шэрагоўцах. Ну а ты паціху прызвычайваесься? Фігня! Моцна не перайmайся, усё мінае. (...)*

*Да, са мной ва Ўрэчча патрапілі трое нашых — Дземіт, Лахмотка й Германовіч. З Лахмоткам мы ў адной батарэі. Вось, бадай, і ўсе навіны. Бывай! Чакаю ліста!»*

Дзімычу не пашанцавала: яго неўзабаве паклалі ў шпіталь з запаленьнем лёгкіх. Прысягу ён прымаў ужо асобна ад сваіх таварышаў, з кім разам прызываўся.

Пасьля таго, як Дзімыч патрапіў у свой ракетны дывізіён, у яго пачалася звыклая служба. 12 жніўня ён мне пісаў у лісьце:

*«Прывітаньне, Санча!*

*Сёньня атрымаў ліст і адразу пішу адказ. Нядзеля, вольны час ёсьць, вось я і пішу ўсім. Справы ў мяне ідуць нармальна. Служба на месцы не стаіць. Цэлымі днямі заняткі. Учора быў у нарадзе па кухні, напахаўся як конь. Затое сёньня балдзею. Тут у нас зьявіўся маг «Вясна». Дык мы яго пускаем праз «Акорд». Вось пішу табе, а пад вухам АББА раве. У нас тут ёсьць і дзьве электрагітары. Дык я брынчу паціху. Як возьмеш у рукі гітару, дык адразу дом згадваецца. Помніш, як мы ў цябе балдзелі. Але нічога, надыйдзе дзень, і мы навярстаем страчанае, а пакуль трэба пахаць. (...)»*

Дзімычу, відавочна, у войску было цяжка. Яму складана было падпарадкоўвацца стараслужачым, жыць безь любімай справы, без сваёй гітары й магнітафона. Але ў лістах да мяне ён асабліва ня жаліўся. Адно падтрымліваў мой баявы дух. Хаця сам, як сьвята, чакаў прыезду сваіх бацькоў.

*«(...) Наконт старыкоў. Патрапіш у частку — сам даведаесься. Дзед ёсьць дзед, і ў нас ён кароль, ну а мы, салагі, пашым як сабакі. У нас пакуль год не адслужыш, ганяюць, як хочуць. Затое потым ты ўжо чалавек, ну а пакуль укалываю.*

*У гэтую суботу да мяне прыяжджалі бацькі. Ад'еўся й нагаварыўся ўволю. Далі звальняльную, карацей, я зь імі два дні жыў у гатэлі. Сфоткаўся, неўзабаве дашлю табе фотку. А фотасправай у нас займаюцца толькі дзяды, нам пакуль яшчэ ранавата, але нічога, прыйдзе і наш дзень.*

*Санча! Ты прасіў словы і акорды песьні «У моря». Акорды: ля мінор, соль мажор, фа мажор, мі мажор. Словы я цалкам ня помню, вось тое, што згадваецца:*

*У моря, где чайки кружатся,*
*На фоне зелёных акаций*
*Заснята была для кого-то,*
*Я в книге нашёл твое фото!*

*Кто ты, кто ты, незнакомка,*
*Нежный облик как-то скомкан.*
*Вместо грусти солнца свет...*

*Тут я ня помню радку. Калі ты мэлёдыю помніш, ты разьбярэсься. Ну вось, бадай, і усё, пішы пра сябе больш.»* (па штэмпелі на капэрце 22.08.79).

З кожным месяцам Дзімычу ў войску рабілася вальней. Затое ў мяне ў Пячах было горача. Пяхотная сяржанцкая вучэбка, гэта, бадай, самае цяжкае ў тадышняй савецкай арміі, калі не лічыць якія-кольвечы экстрымы, як падводная лодка, альбо дэсантныя войскі. Дзімыч, як мог, мяне падтрымліваў лістамі.

*«(...) Насамрэч, у нашай частцы жыць можна. Можна хадзіць у кіно ў буднія дні, праўда, за свае грошы; каляровы целік у казарме, «Акорд». Праўда, «Акорд» зараз ня пашыць: зламалася іголка, а тут нідзе не знайсьці — дэфіцыт. Ну што яшчэ новага? Да, ты, я гляджу, ўсё ў вайну там гуляеш. Бегаеце, страляеце. А я тут за чатыры месяцы толькі раз з аўтамата і страляў. Трымайся! (...) 30.08.79»*

Праз год Дзімыч у сваёй вайсковай частцы абжыўся, звыкся й пачаў займацца сваёй любімай справай. Ён нават з саслужыўцаў стварыў рок-гурт.

*«(...) Да, Санча, я тут раз быў граў на танцах у афіцэрскім клюбе. Ні я адзін, у нас тут, між іншым, гурт складваецца. Дык вось, адзін раз запрасілі пайграць на танцах. Атрымалася ў нас, канешне, ня вельмі — сыгранасьці няма, але агулам сайшло. Але, галоўнае, паглядзеў на "гражданку", як людзі адпачываюць. Да чаго мутарна стала. Сам павінен разумець. (...) 25.08.80»*

Далейшае нашае ліставаньне было няроўным. Дзімыч пэрыядычна езьдзіў у камандыроўкі на баявыя стрэль-

бы, аднойчы вазілі іх ажно ў Казахстан. Апошні ліст, які я атрымаў ад Дзімыча, быў напісаны ім 6 кастрычніка 1980 году. Гэта было якраз перад камандыроўкай на казахстанскі палігон.

*«Да, вось мы з табой і дзяды. Засталася ерунда якаясь, пайгады. У нас дзембялёў пачынаюць звальняць з 20 кастрычніка. Санча, а як ты жывеш? Што ў цябе новага? Фотку я тваю атрымаў, дзякуй. Ведаеш, ты, памойму, не зьмяніўся. Толькі хіба што пасталеў. Але гэта і зразумела, бо нам з табой ужо па 20. (...)*

*Санча, каб ты ведаў, як я сумую па сапраўднай музыцы. Ты там хоць слухаеш што-кольвечы новае? (У Берасьці пасьля адбою ў ленкомнаце мы глядзелі па польскім тэлебачаньні музычныя перадачы. — А.А.) А я, як пайшоў у армію, дык нічога новага й ня чуў. Прыйду дамоў, адразу куплю сабе добрую апаратуру.*

*Ну вось, бадай, і усё. Пішы. Да пабачэньня.»*

Да пабачэньня, Дзімыч. Пісаць ужо няма куды. Толькі зараз зразумеў, што мы пасьля войску так і не сабраліся ўсе разам, не пагутарылі, не памарылі пра нешта сапраўднае, істотнае. Прабач, Дзімыч, што не падтрымаў цябе ў цяжкую гадзіну. Ты, па-просту, ня змог самастойна знайсьці высьце са свайго жыцьцёвага лябірынту. Мне здаецца, калі б ты быў побач, у мяне на відавоку, калі б мы трымаліся надалей разам, я ня даў бы табе сасьлізнуць у невараць. Ты ня быў кімсьці канчаткова згубленым. Ты проста заблукаў.

Недзе на антрэсолях у маіх бацькоў ляжыць бабіна з запісам нашага першага і адзінага музычнага альбома. Наш гурт так і не атрымаў назвы. Я назаву яго постфактум «САНЧА І ПАНСА».

*09.07.2008 г.*

* * *

*Данілу*

пачнем спачатку
каб унікнуць канца

самы надзейны спосаб

гэта нават не вяртаньне
хутчэй адмысловы працяг

пазьней я пакажу табе
свае любімыя мясьціны:
рачулку што блукае між пагоркаў
і заімшэлых вялікіх камянёў —
нібыта зачараваныя валадары
яны ахоўваюць велічнае навакольле

дрэвы тут шапочуць
без дапамогі ветру

ўсё гэта будзе тваё

бо нельга забраць у чалавека тое
што ён любіць

як нельга адабраць у неба
аблокі

кожны нараджае сваю любоў
але ёсьць тая любоў
якая нарадзіла цябе

ня ў нас усё
але праз нас

* * *

марыць па-сапраўднаму
гэтага ў нас ніхто не адыме
пра што — неістотна
бо марыць —
як мець надзею
на лепшае і сьветлае
і неістотна што сьвет
як дзіцячы калейдаскоп
пры кожным руху
укладае новы малюнак
з прастакутнікаў ромбікаў
трохкутнікаў і кружочкаў —
падставовых матэрыялаў
для любой сур’ёзнай справы

мара — гэта вочка калейдаскопу
глядзець у якое дазваляецца
у час гульні зь дзецьмі
у час сьвята нашага таямнічага
і ў свой апошні час

# ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ

Штогод 3 ліпеня, на Дзень вызваленьня Менску ад фашыстоўскіх захопнікаў, дзед Антон езьдзіў на сустрэчу былых партызанаў брыгады «Сьмерць фашызму».

Сустрэча ладзілася ў вёсцы Юрава (мясцовыя жыхары называюць вёску менавіта так, а ня Юр'ева) побач з брацкай магілай загінулых у Другой сусьветнай вайне. На магіле ўсталявалі помнік: салдат у плашчпалатцы з аўтаматам. Некалькі разоў дзеда адвозіў на сваёй машыне мой бацька, які за кампанію браў і мяне. Такім чынам, езьдзілі мы ўтрох: я, бацька і дзед. Старэйшы сын і старэйшы ўнук.

Прыбыўшы на месца, дзед Антон папярэджваў нас, што доўга не забавіцца, каб мы яго пачакалі.

3 ліпеня ў Юраве было мнагалюдна, як у вялікім горадзе. Грала музыка, луналі сьцягі, працаваў выязны гандаль, праз кожныя дзесяць мэтраў дыміліся паходныя мангалы, дурманячы пахам смажанага мяса. Сьвята пачыналася мітынгам ля помніка — урачыстымі прамовамі былых камандзіраў, піянерскімі салютамі й гукамі горнаў. Пасьля ўрачыстай часткі ўдзельнікі сустрэчы дзяліліся на групы — па колькасьці атрадаў, зь якіх складалася брыгада «Сьмерць фашызму». Кожны атрад адзначаў Дзень вызваленьня ў сваім коле. Выглядала, што для тутэйшых партызанаў 3 Ліпеня было большым сьвятам за 9 Траўня, Дзень перамогі. Беларусь няшмат мела ўласных сьвятаў. Бадай што толькі адно. Скончвалася ўсё тым, што партызанаў шукалі і зьбіралі па ўсім навакольлі. Вясковыя кабеты зь Юрава і суседніх вёсак звычайна даручалі гэта сваім дзецям або ўнукам, якія павінны былі пільнаваць пераможцаў.

Былыя народныя мсьціўцы любілі зьбірацца на гэтае сьвята ня толькі праз дармовую гарэлку. Тут нярэдка

вырашаліся прыватныя праблемы, бо рэспублікай на той час працягвалі кіраваць партызанскія камандзіры. У Дзень вызваленьня ў Юраве заўжды было каму паскардзіцца на несправядлівасьць. Начальнікі прыяжджалі нават з Масквы. Кагосьці абдзялілі кватэрай, нехта пазбавіўся пасады, камусьці несправядліва прызначылі пэнсію. Баявога таварыша нельга было пакідаць у бядзе.

Антон Іванавіч сапраўды ня бавіўся. Перакідваў чарку-другую, сьвятая справа, але ніколі не вяртаўся ў Жодзіна п'яным. Такога я ня помню. Як правіла, ён не заставаўся на атрадныя пагулянкі ў вузкім коле. Падобна, ён ня меў партызанскіх сяброў. Выключэньнем, бадай, былі Іван Найдзёнаў, былы камандзір партызанскага атраду імя Будзёнага брыгады «Сьмерць фашызму», і легендарная доктарка з гэтага ж атраду — Марыя Сіліч, якая пасьля вайны стала жонкай Найдзёнава. У 50-60-х гадах іх нярэдка, асабліва на сьвяты, можна было пабачыць за сямейным сталом у доме Антона Іванавіча. Дзіўна, але камандзір Найдзёнаў не зрабіў пасьля вайны кар'еры. Ён працаваў сьціплым начальнікам будаўнічай групы пры СмалДРЭС. У той час як іншыя камандзіры з брыгады «Сьмерць фашызму» па вайне працавалі сама менш у райкамах і райвыканкамах. Напрыклад, іншы камандзір з брыгады «Сьмерць фашызму» Георгій Шчамялёў, які ўзначальваў атрад імя Чкалава, па вайне працаваў у Смалявіцкім райкоме партыі, райвыканкаме, і нават Менскім аблвыканкаме. Цікава і тое, што пра Георгія Найдзёнава няма пэрсанальных зьвестак у кнізе «Памяць. Смалявіцкі раён. Жодзіна». Затое пра Шчамялёва — цэлы артыкул. Багата ў розных энцыкляпэдыях згадак пра іншага камандзіра з брыгады «Сьмерць фашызму» — Івана Дзёміна. Так, гэта той самы Дзёмін, які па вайне будаваў Мінскі аўтамабільны завод і ў 70-х гадах быў генэральным дырэктарам «Белаўтамазу».

Але вернемся ў Юрава на сьвята вызваленьня Беларусі. Адвозячы дзеда Антона дахаты, ня помню, каб ён нешта апавядаў па дарозе.

У дзяцінстве я не зьвяртаў увагі на тое, што дзед доўга ня бавіўся з аднабрыгаднікамі: балазе тыя дзьве-тры гадзіны

да чорцікаў надакучвала яго чакаць, дый ня мог тое зразумець дзіцячым розумам. Дарэчы, якраз у тыя гады, у пэрыяд моцнай партызанскай улады ў Беларусі, дзед Антон пазбавіўся сваёй пасады — начальніка жодзінскай чыгуначнай станцыі. Гады ўжо былі ня тыя, дый ня меў адпаведнай адукацыі. Далей ён працаваў сьціплым дзяжурным па вакзале. Ня думаю, што ён каму-небудзь скардзіўся з тае нагоды.

У Жодзіне Антон Іванавіч апынуўся ў 1938-м: перавялі са станцыі Слаўнае, што на Талачыншчыне. У той год амаль усе жодзінскія чыгуначнікі былі арыштаваныя й асуджаныя як шкоднікі і ворагі народу. На вызваленыя працоўныя месцы сьцягвалі спэцыялістаў зь іншых мясьцінаў. Антону Іванавічу ішоў 27-ы год, меў сям'ю, дзяцей. Мой бацька ў сям'і быў старэйшы, яго прывезьлі ў Жодзіна ў трохгадовым узросьце. Антона са Слаўнага прызначылі начальнікам станцыі. Магчыма, усіх астатніх работнікаў проста набралі з навакольных вёсак.

Калі пачалася вайна, у сям'і Антона Іванавіча было ўжо чацьвёра дзяцей: Барыс, Люба, Тамара і Толя. Вялікая сям'я. Пра сумесную эвакуацыю ў глыбіню краіны не магло быць і размовы: чыгуначнікі павінны заставацца на працоўным месцы да апошняга эшалёну. На восьмы дзень вайны ў Жодзіне ўжо былі немцы.

Чыгуначнікі былі патрэбныя і новай ўладзе — усім было загадана выйсьці на працоўныя месцы. Ясна, што Антон Іванавіч ня мог рызыкаваць сям'ёй. Чыгуначнікі вымушаныя былі падпарадкавацца.

Пасьля таго, як у ваколіцах Жодзіна паўстаў партызанскі рух, а была гэта тэрыторыя дзейнасьці брыгады «Сьмерць фашызму», партызаны хутка наладзілі сувязь з працаўнікамі чыгункі. Відавочна, недзе ў 1943 годзе і мой дзед стаў «агентам» партызанкі.

Антон Іванавіч любіў зьбіраць грыбы. Быў вялікім аматарам, і яму заўжды шчасьціла. Часам браў з сабой старэйшага сына. У лесе, як згадвае мой бацька, ён сустракаўся зь нейкімі невядомымі людзьмі, вёў зь імі працяглыя гутаркі. Трэба меркаваць, гэта і былі партызаны. У жніўні 1943 го-

ду адзін зь нямецкіх спэцыялістаў, паляк па прозьвішчы Шваб, папярэдзіў Антона Іванавіча пра плянаваныя арышты сярод жодзінскіх чыгуначнікаў. Дзед Антон, не марудзячы, у тую ж самую ноч пасадзіў сям'ю на падводу і накіраваўся ў лес, у партызанскую зону. Прытулак знайшлі ў сям'і Невяровічаў зь вёскі Чэмкі, гэта ў некалькіх кілямэтрах ад славутага старажытнага Юрава.

Дарэчы, зь Юрава паходзіў вядомы беларускі археоляг Аляксандар Ляўданскі, які патрапіў пад рэпрэсіі і быў растраляны ў «напалмавым» для беларускай інтэлігенцыі 1937-ым.

Сам Антон Іванавіч падаўся ў партызаны. Аднак узьнікла праблема: у народныя мсьціўцы прымалі толькі тых, хто меў зброю — яе трэба было раздабыць самастойна. У Чэмках чыгуначніку падказалі, што вінтоўку можна знайсьці на дне рачулкі Цна, якая працякала побач зь вёскай. Іх туды паўкідалі ў 41-ым савецкія акружэнцы. Антон Іванавіч некалькі дзён шукаў зброю, ныраў і абмацваў дно рачулкі. Вяскоўцы не падманулі — вінтоўка знайшлася. Чыгуначніка прынялі ў атрад імя Чкалава.

Цікава, што ў гэтым жа атрадзе быў і пісьменьнік Іван Сіняўскі. Яго прынялі ў «чкалаўцы» таксама ў 1943 годзе. Не маглі яны ня быць знаёмымі, а можа нават і хадзілі разам на заданьні. Неяк тут адразу згадваюцца творы Васіля Быкава. Дарэчы, зь Сіняўскім здарылася абсалютна быкаўская гісторыя. На адным з заданьняў будучы пісьменьнік з таварышамі патрапіў у засаду. Пачаўся бой. Сілы былі няроўныя. Партызаны пачалі адыходзіць ад дарогі, на якой меркавалі закласьці міны. Адзін з падрыўнікоў, Сяргей Кавалеўскі, загаўроніўся. Меў яшчэ магчымасьць адыйсьці пад прыкрыцьцём байцоў групы, але ня стаў гэтага рабіць. Калі немцы атачылі «ляснога бандыта», навакольле скалануў выбух — разам з партызанам загінулі ворагі. Усё гэта адбылося на вачах у Сіняўскага. Пасьля вайны пісьменьнік хадайнічаў у розныя інстанцыі, каб подзьвіг таварыша быў пасьмяротна адзначаны, але так і не дамогся справядлівасьці. Адзінае што зрабіў у памяць: напісаў пра сябра нарыс.

Цікава, ці хадзіў Сіняўскі на заданьні з маім дзедам Антонам? Ці выпіваў разам на вызваленчых сустрэчах у Юраве? А дарма не таварышаваў, бо атрымаў бы цудоўныя сюжэты для твораў. Я пачуў гэтыя гісторыі ад майго бацькі. Найбольш мне падабаецца сага ўратаваньня.

Адбылося гэта ў чэрвені 1944 году падчас самай моцнай блякады партызанскай зоны. Немцы кінулі на барацьбу зь «ляснымі бандытамі» вялікія армейскія сілы. Некалькі партызанскіх атрадаў, ня толькі з брыгады «Сьмерць фашызму», трапілі ў кацёл у раёне возера Палік. Партызаны і мірнае насельніцтва, якое жыло ў лесе пад апекай лясных змагароў, былі загнаныя ў топкія балоты. Партызаны пайшлі на штурм аднаго з участкаў нямецкага ачапленьня, прарваліся й расьсеяліся па лесе, каб затым сабрацца ў прызначаным месцы. Немцы пачалі шчыльна прачэсваць усё навакольле. Адзін з такіх нямецкіх ланцугоў прыціснуў дзеда Антона да берага Бярэзіны. Кемлівы партызан прыняў рашэньне: ён выразаў чарацінку, нырнуў у ваду і закамуфляваўся водарасьцямі й цінай. Неўзабаве немцы выйшлі на той самы бераг. Хтосьці зь іх заўважыў шапку дзеда у вадзе. Яны пачалі торкаць штыхамі, дасталі шапку, паўглядаліся, пастаялі, пачакалі, адзін зь іх справіў малую патрэбу ў ваду ледзь ні на галаву дзеду. І сыйшлі. Уяўляю тую радасьць, калі дзед вынырнуў з вады з чарацінкай у зубах і пабачыў, што немцаў няма. Як у якім вэстэрне. Жыцьцё бывае круцейшым за любое кіно.

У той самы час у тых балотах шукала ратунку мая бабуля Ганна з чатырма малымі дзецьмі. Нямецкія ланцугі таксама праходзілі зусім побач. Былі чутны воклічы, ляскат зброі, стрэлы. Самага малодшага, Толю, які бесьперапынна плакаў і прасіў есьці, прыходзілася тварам прыціскаць да моху.

Да 3 ліпеня было зусім недалёка. Ужо лічаныя дні. Але трэба было ўратавацца, выжыць, дачакацца вызваленьня.

*6 ліпеня 2008*

# НАПЯРЭДАДНІ РАДАЎНІЦЫ

Гэтым разам пашанцавала. Звычайна прыяжджаю да бацькоў у Жодзіна на дзень-два. Пляную зрабіць шмат, але, як правіла, нічога не пасьпяваю і ўсё адкладаецца на наступны год. Затым яшчэ на наступны. І яшчэ. У выніку ўсе пляны ляцяць у тартарары і я беззваротна губляю самае каштоўнае: магчымасьць пабачыць і пачуць цікавых мне людзей. Не магу дараваць сабе, што не пасьпеў запісаць успаміны бабулі Насты, якая апошнія месяцы свайго жыцьця правяла ў кватэры маіх бацькоў. Маці прывезла яе з Арлова зусім ужо слабую. Яна практычна цэлы дзень ляжала на канапе ў маім пакоі, ужо амаль нічога ня бачыла, але мела цьвярозы розум і магла доўга сэнсоўна гаварыць на чысьцюткай літаратурнай беларускай мове. Іншай яна ня ведала. З кімсьці гутарыць — было для яе апошняй формай існаваньня, кантакту з навакольным сьветам, адзіная сувязьзю з жыцьцём. А бяз справы яна не магла. Маці спрабавала раней забраць яе зь вёскі, калі бабуля яшчэ ўпэўнена тэпала па ўласным падворку, але яна і слухаць не хацела. Маўляў, што буду рабіць у чатырох сьценах тваёй гарадзкой кватэры?

Такім чынам, я меў апошні шанец: не сьпяшаючыся, магчыма, на працягу некалькіх дзён, распытаць бабулю пра усё, што мяне цікавіць. Спазьніўся. Адно, другое, трэцяе, усялякія дробныя праблемы й сямейныя клопаты. Нібыта зьбіраюся ехаць на наступным тыдні, затым адкладаю на наступны месяц, затым захварэў сын, затым праблемы на працы, затым сэмінар маладых літаратараў, затым... Затым прыходзіць сумная вестка. І разумееш, што ня проста страціў любімую бабулю — абарвалася нітачка, якая зьвязвала цябе з падзеямі пачатку 20 стагодзьдзя, з падрабязнасьцямі, з камэнтарамі, зь інфармацыяй пра прадзедаў і прапрадзедаў, якую ўжо ніколі не даведаесься. Разумееш, што абрабаваў

сябе татальна. А бабуля ў свае 90 гадоў мела фантастычную памяць: памятала даты самых будзённых падзеяў, чым мяне надзвычай зьдзіўляла. Падлеткамі мы, унукі й унучкі, прыяжджалі да яе ў вёску адпасьвіць радоўку. Увечары, кормячы нас за вялікім драўляным сталом, яна абавязкова апавядала што-кольвечы зь мінулага і кожная гісторыя мела сваю прывязку да часу: дату або рэлігійнае сьвята. У памяці ад тых аповедаў нічога не засталося, толькі зьдзіўленьне: як гэта яна ўсё памятае?

І вось я, як апошні манкурт, не скарыстаўся з гэтай цудоўная памяці. І ніякага апраўданьня майму лайдацтву няма.

Дакараю сябе і яшчэ з адной нагоды. Я так і не пазнаёміўся зь пісьменьнікам Іванам Сіняўскім. Ён жыў непадалёк ад Жодзіна, у вёсцы Жажэлка, дзе выкладаў у тамтэйшай школцы. Жажэлка знаходзіцца за 5-6 кілямэтраў ад Жодзіна, і калі-небудзь горад абавязкова паглыне гэты населены пункт, як паглынуў ужо зь дзясятак іншых навакольных вёсак. Таму Івана Сіняўскага можна лічыць жодзінскім пісьменьнікам: балазе ён пісаў шмат нарысаў пра Жодзіна, асабліва пра БелАЗ і яго працаўнікоў. Некалі якомусь рупліўцу трэба будзе сабраць іх разам і выдаць асобнай кнігай.

Іван Сіняўскі быў адзіным прафэсійным літаратарам у нашых краях, зьяўляўся сябрам Саюза пісьменьнікаў і пэрыядычна выдаваў кнігі, у асноўным для дзяцей. Менавіта Сіняўскі напісаў кнігу пра «На правым флянгу» Пятра Купрыянава — жодзінскага героя Савецкага Саюзу, які падчас Другой усясьветнай вайны паўтарыў подзьвіг Аляксандра Матросава, закрыўшы сваім целам амбразуру дзота. У горадзе ёсьць помнікі герою, музэй. Сіняўскі сярод першых прычыніўся да паўставаньня гэтай жодзінскай легенды.

Але мяне пісьменьнік цікавіў зь іншай нагоды, так бы мовіць, непрафэсійнай: ягоны бацька, якога таксама звалі Іван Сіняўскі, сябраваў з маім дзедам Захарам Пятровічам, мужам бабулі Насты. Пра гэта я дачуўся ад сваёй маці і ад яе сясьцёр і братоў. Звычайна пра гэтае сяброўства

згадвалі на могілках вёскі Бабін Лес, калі сваякі зьбіраліся ля магілы дзеда на радаўніцу: магілы Івана Сіняўскага і Захара Пятровіча знаходзяцца побач. Абодва пайшлі з жыцьця ваенным часам. У дзяцінстве на могілках я ня раз бачыў самога пісьменьніка Сіняўскага. Але тою далёкай парой на гутарку зь ім я ніколі б не наважыўся. Ды й ня вельмі мяне тады захаплялі гісторыі мінулага.

Іншая справа, калі я вырас і пачаў цікавіцца сваім радаводам. Упэўнены, Сіняўскі ведаў майго дзеда і багата б чаго распавёў. Асабліва пра 30-я гады, калі дзеда Захара ўпарта імкнуліся раскулачыць і загнаць у калгас. Але і тут я спазьніўся. Івана Сіняўскага ня стала раней, чым я сабраўся зьезьдзіць да яго ў Жажэлку.

Увогуле Іван Сіняўскі падаецца мне моцным, разумным, упартым і таямнічым чалавекам. Мне да сёньня незразумела, чаму ён пабудаваў магільны склеп для сваёй дачкі на тых самых бабілескіх могілках, дзе пахаваны і яго бацька. Дачкі ня стала, калі ёй было ўсяго 14 гадоў. Упала з падводы, выцяла нагу, пачалася сур'ёзная хвароба. Сіняўскі вазіў яе да вядомых дактароў у Кіеў, у Маскву. Уратаваць ня здолеў. Пахаваньне адбылося незвычайнае: пісьменьнік пабудаваў трывалы бэтонны склеп, у якім зьмясьціў залітаваную ў мэталічную скрыню труну. Я неаднойчы ў дзяцінстве, пераадолеўшы страх, спускаўся па прыступках уніз, адчыняў рыплівыя мэталічныя дзьверы і заглядаў у падземны пакой. Там заўжды было прахалодна, скрушна і ціха. З правага боку ля сьцяны стаяла вялікая мэталічная скрыня. Я толькі заглядаў з парога ў сярэдзіну і ніколі не насьмельваўся зайсьці ўнутар. Наколькі памятаю, мэталічныя масіўныя дзьверы заўжды былі незамкнёныя. Неяк я спытаў бацьку: навошта Сіняўскі ў такі спосаб пахаваў сваю дачку? Бацька выказаў навукова-фантастычную вэрсію: маўляў, магчыма, Сіняўскі верыць у тое, што з часам навука вынайдзе спосаб ажыўляць мёртвых людзей. Пахаваўшы такім чынам, ён пакінуў для дачкі шанец.

Мне зараз больш праўдзівай падаецца іншая вэрсія. Сіняўскі папросту вырашыў пабудаваць сямейны магільны склеп, як тое рабілі старым часам магнаты й заможныя

шляхціцы. А калі згадаць, што гэта адбылося ў 60-ыя гады, за часамі Хрушчова, дык учынак той, бадай, можна назваць мужным. Балазе над уваходам быў выраблены бэтонны крыж. Але чаму тады труна самога Сіняўскага не заняла сваё месца ў склепе? Пытаньне заставалася без адказу.

Гэтым разам пашанцавала. Прыехаў я ў Жодзіна за тыдзень да радаўніцы. На другі дзень па маім прыезьдзе маці сказала, што зьбіраецца з бацькам ехаць на бабілескія могілкі прыбраць бацькоўскія магілы. Я, жонка Таццяна й мой малодшы пяцігадовы сын Даніла выказалі жаданьне паехаць зь імі.

Могілкі былі амаль пустыя. Толькі ў нашым куце я заўважыў дзьве постаці. Сталыя кабета й мужчына наводзілі парадак на магіле Івана Сіняўскага. Мужчына заўважна кульгаў. Было бачна, што ён толькі дапамагаў жанчыне, што магілы, якія яна прыбірае, *ейныя*. Я гэта неяк адразу інтуітыўна вызначыў. Я павітаўся і з максымальнай добразычлівасьцю спытаў у жанчыны: «А хто тут у вас пахаваны?» Жанчына нібыта ўзрадавалася майму пытаньню. Выпрасталася, твар яе расквеціўся усьмешкай і яна пачала апавядаць: «Гэта тата мой, я яго й ня помню. Калі тату забілі немцы, была зусім малая. Пасьля ўжо больш дарослыя расказвалі: прывезьлі яго, увесь у крыві, а я па ім поўзаю і плачу: «Тата, навошта ты мяне такую малую пакінуў?» У мяне былі белыя валосікі — прыгожыя; маленькая, усе вакол глядзяць на мяне і плачуць. Хтосьці яго выдаў, падцікавалі, злавілі.» — «Дык вы, атрымліваецца, сястра Івана Сіняўскага?» — «Так, яго малодшая сястра. Мы жывем у Напалках. Во з гаспадаром прыехала магілы прыбраць. Там і кабыла наша стаіць, Машка». Яна кіўнула ў бок агароджы. За агароджай сапраўды можна было пабачыць падводу. Напалкі — гэта суседняя з Жажэлкай вёска, а гэта ня так ужо й блізка да гэтых мясьцінаў. «Дык і гэта ваша магіла?» — Я паказаў вачыма на магільны склеп. «Наша. Тут дачка Івана пахаваная.» — Жанчына пачала апавядаць пра тую даўнюю трагедыю, што надарылася з дачкою. Тут падыйшоў мой Даніла, узяў мяне за руку й загадаў ісьці разам зь ім падзівіцца на каня. «Давай-

це я Вас сфатаграфую», — прапанаваў я жанчыне, дастаў з кішэні фотаапарат, сфатаграфаў яе побач з помнікам на бацькавай магіле і пайшоў глядзець Машку. Празь якіх пяць хвілінаў, задаволіўшы сваю цікаўнасьць, Даніла пабег да маці, а я вярнуўся да жанчыны. Пабачыўшы мяне побач, кабета зноў прыязна пасьміхнулася і таропка загаварыла: «А тут і іншыя нашы магілы. А вунь тая, гэта першая жонка Івана...» Мне не цярпелася задаволіць сваю цікаўнасьць, і я, не даслухаўшы кабету, спытаў: «А чаму Ваш брат вырашыў так пахаваць дачку?» — «Ат і ня ведаю. Недзе тое вычытаў. Усе грошы, што атрымаў за кніжку, аддаў на гэта. Ён тут і сам павінен быў ляжаць, ды, ай...» Жанчына неяк сумелася, было бачна, ёй не хацелася закранаць гэтую тэму. «А дзе пахавалі вашага брата?» «Здаецца, у Жодзіне, на судабоўскіх могілках, — сказаўшы гэта, яна перапытала ў свайго мужа, нібыта ўдакладніла — ці сапраўды ў Жодзіне. — Кажуць, жонка паставіла добры помнік.» Атрымлівася, яна ня бачыла магілы брата. Гэта мяне надзвычай зьдзівіла. Штосьці, відавочна, здарылася, пасьля чаго радзіна адвярнулася ад пісьменьніка. «Давайце памянем родных», — раптам прапанавала жанчына, нахінулася да сумкі, што ляжала ля агароджы і дастала пляшку таннага віна. — «Я ўжо ня буду, а вы з гаспадаром памяніце». Яна аддала пляшку мужчыне, каб той адкаркаваў. Затым наліла віна ў шклянкі. Мужчына, пакуль я размаўляў з кабетай, не прамовіў ані слова. Спачатку ён насіў сьвежы пясок на магілу, а затым проста моўчкі стаяў у баку. Пакуль кабета налівала, я, зьвяртаючыся да мужчыны, сказаў: «Чытаў адну аповесьць Івана, у якой ён апісвае, як правёў у дзяцінстве лета на хутары свайго дзеда. А дзе быў той хутар?» Гаспадыня пачала накладаць на місу закуску: кавалкі кілбасы й сала. Мы выпілі. Узрадаваўшыся, што я зьвярнуўся да яго, мужчына пачаў тлумачыць. Я ўдакладніў: «Там напісана, што хутар стаяў на беразе Брадзянкі.» — «Правільна, там Брадзянка і працякае». Я пачаў згадваць назвы лясных масіваў з кнігі: Цыганка, Шнурок, Каланча. Мужчына і тут прадэманстраваў свае веды. Затым мы згадалі суседнія вёскі. Кабета наліла ў шклянкі яшчэ раз. Я папрасіў, каб гэтая была апошняй.

Яна лёгка на тое пагадзілася. Мы зноў выпілі. Гаспадыня пачала распавядаць пра сваіх дзяцей. Мне карціла запытаць што-кольвечы яшчэ пра Сіняўскага-пісьменьніка. Але пытаньне ніяк не атрымлівалася адпаведным чынам сфармуляваць. Спытаць у лоб, якая котка прабегла паміж братам і сястрой, я не рашаўся.

Жанчына дала каманду мужу зьбірацца. Я пайшоў усьлед за старымі да падводы. Тут я іх яшчэ раз сфатаграфаваў. «А картачкі будуць?» — спытаў гаспадар. «Давайце адрас, дашлю.» Ні ў мяне, ні ў іх не аказалася чым запісаць адрас. «Вы пад'едзьце да нашай машыны, думаю, там знойдзем чым запісаць.» Да машыны я пайшоў праз могілкі, а яны паехалі ўздоўж агароджы. Мае ўжо чакалі мяне ў машыне. Аказалася, нашыя магілы ўжо нехта перад намі прыбраў і маці толькі памыла надмагільныя помнікі. Асадку знайшлі, праўда, яна пісала кепска, але я сяк-так усё ж запісаў адрас і тэлефон маіх новых знаёмых.

«Давайце вас пакатаем крыху з сынам.» — Жанчыне хацелася зрабіць для мяне яшчэ штосьці добрае. Я пераказаў прапанову Данілу, той з радасьцю пагадзіўся. Мы селі зь ім на лаўку ў падводзе. Гаспадар нацягнуў лейцы, Машка паслухмянай рухава заклыпала па асфальце ў бок Арлова. Праехаўшы мэтраў трыста, мы падзякавалі, зьлезьлі з падводы і разьвіталіся. «Менш чым праз гадзіну будзем дома,» — упэўнена сказаў гаспадар і тарганула лейцы.

«А чаму Сіняўскі са сваякамі разыйшоўся?» — спытаў я ў маці па дарозе дадому. «А хто яго ведае, — адказала маці дыпляматычна, — можа, з-за таго, што кінуў першую жонку і ажаніўся з маладой, казалі, нібыта са сваёй былой вучаніцай».

Тым часам мы якраз праяжджалі празь невялікі масток над Брадзянкай. Вузенькая палоска рачулкі бегла пасярод лугу і амаль гублялася за якіх сто мэтраў.

«Прыемная гэтая жанчына, сястра Івана Сіняўскага, — думалася мне па дарозе. — Абавязкова дашлю ёй фотаздымкі. А можа і патэлефаную».

*5.06.2008*

Барыс Козік

# КАЛЯ ЧЫГУНКІ

# КАЛЯ ЧЫГУНКІ

## Мае ўспаміны пра вайну ды мінуўшчыну

Я нарадзіўся 12 траўня 1935 году ў сям'і працаўнікоў чыгункі. Бацька быў у той час дзяжурным па станцыі Слаўнае, а маці — білецёркай. Нарадзіўся ў чыгуначнай бальніцы гораду Барысава, назвалі мяне ў гонар гэтага слаўнага ды старажытнага гораду Барысам. Род Козікаў паходзіць зь вёскі Загор'е, што месьціцца непадалёк ад станцыі Слаўнае. Бабулі й дзядулі па бацькавай лініі я ня бачыў, яны памерлі да вайны, толькі памятаю, я быў на пахаваньні дзеда перад вайною. Мой дзіцячы ўспамін захаваў месца, дзе былі могілкі, — недзе недалёка ад чыгункі.

У Козіка Івана, майго дзеда, было пяцёра дзяцей: Карней, Пётар, Віктар, Антон і Варвара. Усе яны працавалі на чыгунцы.

Дзявочае прозьвішча маёй маці, Ганны Іванаўны, — Сушко. Родам яна зь вёскі Азярцы, што пад Талачынам. Дзед Іван быў жанаты двойчы. Ад першай жонкі нарадзіліся Марыя й Ганна, ад другой — Аляксандар і Алена.

Мачаха была суворай у дачыненьні да маёй мамы й цёткі Марыі: са словаў мамы, дрэнна карміла, аднойчы апарыла кіпенем. Яе дзеці атрымалі адукацыю. Аляксандар служыў у войску. Алена, з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, працавала ў нейкім ведамстве эканамістам.

Дзеда Івана я памятаю: у 1947 годзе ён прыехаў да нас у госьці, меў хваробу сэрца. Мой тата звазіў яго ў Менск у Цэнтральную чыгуначную паліклініку, а назаўтра сэрца ягонае спынілася. Мае бацькі былі ў шоку.

Маміну мачаху апошні раз бачыў недзе ў другой палове 1960-х гадоў — гасьцявалі ў Марыі Іванаўны.

Пра больш старажытныя свае карані я, на жаль, нічога ня ведаю.

**Перадваенныя гады** памятаю слаба. Памятаю прыезд на сталае месца жыхарства ў Жодзіна (1938 г.). Падагналі вагон (цялятнік) на запасны пуць проста да дому (дом знаходзіўся, прыкладна, дзе цяпер чыгуначная крама). Бацькавыя саслужыўцы дапамаглі свайму новаму начальніку станцыі перанесьці рэчы ў кватэру. На станцыі Жодзіна ў той час быў драўляны вакзал і два двухкватэрныя жылыя дамы для працаўнікоў. Проста ад вакзалу вуліцаю можна было выйсьці на Барысаўскі тракт, дзе месьціліся: школа, царква, трохі далей ад царквы на іншы бок дарогі сельсавет і хата-чытальня. На Барысаўскім тракце знаходзілася вёска Падасоўе. За гародамі падасаўчанаў, у кустоўі, пятляла рачулка Пліса. Хачу сказаць, рыбная рачулка, бацька часта прыносіў з рыбалкі (рыбаліў сеткай) па вядры рыбы. Па іншы бок ад чыгуначных пуцей, за мэтраў дзьвесьце, было ў кустоўі невялікае рыбнае азярцо; далей ад азярца ў бок Менску стаялі баракі для вязьняў-будаўнікоў. На ўказаньне Сталіна будавалася асфальтавая дарога Масква—Менск і дзьве каменкі (брукаванкі?): Жодзіна—Негарэлае і ад Жодзіна ў бок мяжы (1940 г.).

Хачу сказаць, што побач зь лягерам для вязьняў знаходзілася і часовае жытло аховы лягеру й службоўцаў будаўніцтва дарог. Гэтае месца было нібыта культурным цэнтрам мястэчка. У выходныя моладзь з усёй акругі зьбіралася на танцы. Часта хадзілі на танцы й тата з мамаю, часамі яны бралі з сабой і сваіх дзетак: Барыса, Любу, Тамару. Мы вачэй ня зводзілі са сваіх бацькоў. А яны, маладая прыгожая пара, не прапускалі ніводнага танцу.

У адзін з чэрвеньскіх дзён 1941 году да майго слыху даляцела незнаёмае слова **ВАЙНА**. Я запытаўся ў таты, што гэта такое. Ён адказаў: «Нам будзе кепска». Мне ішоў ужо 7-ы год.

І напраўду, праз колькі дзён нам стала кепска й страшна. Бацька прыйшоў дадому і сказаў маме незнаёмае слова *эвакуацыя*. «Зьбірай, Ганна, неабходныя рэчы, дакумэнты, цягнік будзе праз паўгадзіны». Калі мы выйшлі з кватэры да вакзалу, усчалася вялікая сумятня, цягнік рушыў зь месца, людзі выскоквалі з вагонаў, а некаторыя наадва-

рот імкнуліся трапіць у цягнік, што адыходзіў. А зьверху, нізка над цягнікам, лёталі нямецкія самалёты й стралялі з кулямётаў. Да нас падбег бацька, хутка апусьціў усіх у водаправодны калодзеж. Колькі мы там сядзелі, ня ведаю. Калі ўсё навокал сьцішылася, мы вярнуліся ў кватэру. Аднак ненадоўга, у хуткім часе на вакзале зноў пачалася мітусьня. У кватэру прыйшоў бацька і сказаў, каб мы сыходзілі ў вёску Паддуб’е.

Вось сёньня мне 73-і год, а я выразна памятаю нашую страшную вандроўку гэтай палявой дарогай, па баках якой красавала жыта. Маладзіца, на руках у яе дзіця, побач яшчэ трое малых пасьпехам, наколькі дазваляюць малыя дзеці, сыходзяць ад страшнага месца — станцыі Жодзіна, дзе кружляюць самалёты ворага й сякуць з кулямётаў.

Раптам над нашымі галовамі зьявіўся самалёт, маці хутка кінулася ў жыта, мы за ёю, і залеглі; недзе побач пасыпаліся кулі — вораг страляў па маленькіх дзецях. На нашае шчасьце, самалёт не кружляў над намі і мы абышліся адно спалохам.

Спыніліся мы ў Паддуб’і, у саслужыўца таты Копціка Стэпана, які працаваў таварным касірам. Увечары прыйшоў тата й сказаў, што ў Жодзіна ўжо немцы. Чыгуначнікі ў падобных выпадках працоўнае месца пакідаюць апошнімі, забясьпечваючы праход усіх магчымых сваіх саставаў. Тата прынёс з сабой скрыню цукерак «Ирис», як цяпер памятаю, і сказаў, што людзі разабралі з крамы ўсё, што можна было зьнесьці, каб не засталося ворагу.

Праз колькі дзён тата пайшоў у Жодзіна, у хуткім часе вярнуўся з навіною: немцы вывесілі загад: усім служачым чыгуначнай станцыі вярнуцца на працоўныя месцы, абяцалі заробак, за невыкананьне — пакараньне сьмерцю.

Увечары мы былі ў сваёй кватэры і вось што ўбачылі: дзьверы кватэры адчыненыя, дзьверцы шафы адчыненыя, з кватэры нічога ня зьнікла, толькі ў татавым капелюшы ў чалавечым лайне ляжаў партрэт Сталіна.

Дый, зрэшты, нічога й не магло зьнікнуць, жылі мы сьціпла, раскошы ня мелі.

Сапраўды, бацьку далі працоўнае месца — пуцявога рабочага. На працу, як ні круці, хадзіць трэба было, сям'я з шасьці чалавек, усіх трэба карміць.

**Гады акупацыі** я памятаю нядрэнна. Якімі запомніліся немцы? Рознымі. Згадваецца, невялікая гурма маленькіх дзяцей бегае ля спыненага цягніка (састаў ішоў у бок Масквы). Дзятва просіць у немцаў: «Пап гіб брот, пап гіб канфеты». Хто ў рукі дасьць, а хто пад ногі кіне, гурма дзяцей кідаецца зьбіраць. Выбух сьмеху, немцы пацешыліся. А аднойчы з адыходнага цягніка кінулі нам ладны пакунак, мы адзін перад адным кінуліся падымаць яго, а калі разгарнулі пад рогат немцаў, дык у ім апынулася чалавечае лайно.

Практычна зь першых дзён немцы пачалі адлоўліваць габрэяў, цыганоў і адсталых ад сваіх частак чырвонаармейцаў. А бліжэй да восені зьбіралі і звозілі на работы ў Нямеччыну моладзь.

Акупацыйныя ўлады практычна адразу пачалі наладжваць у Жодзіне жыцьцё: адчынілі школу, царкву, паліцэйскую ўправу. Я пачаў хадзіць у школу (буквары былі савецкія). Аднак да Новага году школу зачынілі, а на базе школьнага будынка арганізавалі гарнізон; вакол будынка паставілі высокі плот зь бярвеньня. На бачным месцы павесілі аднаго мясцовага жыхара, які нібыта скраў у немцаў каня. Насамрэч зроблена гэта было для падтрыманьня страху ў мясцовага насельніцтва.

Мая дзіцячая памяць захавала ўражаньне ад тэхнічнай магутнасьці немцаў. Пастаянна праз Жодзіна на Маскву ішлі саставы, гружаныя танкамі, пушкамі, аўтамабілямі, жывой сілай. А ў адваротным кірунку ў «цялятніках» пад узмоцненай аховай везьлі палонных чырвонаармейцаў. Калі састаў спыняўся, людзі ў «цялятніках» прасілі піць і есьці, мы, босыя падшыванцы, кідалі ў аплеценыя калючым дротам акенцы вараную бульбу, моркву, буракі. Ахова часьцей за ўсё імкнулася не заўважаць нашыя дзеяньні, аднак сустракаліся лютыя немцы, якія настаўлялі на нас рулі і шчоўкалі затворамі, — мы ў адно імгненьне разьбягаліся.

А аднойчы адбыўся дзікі выпадак. Недзе бліжэй да зімы спыніўся цягнік зь нямецкай ваеннай тэхнікай. Група нямецкіх салдатаў зь пяці чалавек зайшла ў адну з кватэраў пры вакзале; убачыўшы маладую жанчыну, яны захацелі пазабаўляцца. Муж бараніў яе — яго павалілі, двое прыціснулі мужчыну да падлогі, прыставіўшы да горла дзьвюхручкавую пілу для пілаваньня дроваў, і па чарзе гвалцілі жанчыну, не зьвяртаючы ўвагі на плач маленькіх дзяцей.

Зіма 1941—1942 гадоў у Жодзіне прайшла адносна спакойна. Людзі стаіліся, моладзь разьбеглася па вёсках і лясах, каб ня быць забранай у Нямеччыну.

Аднойчы ўзімку 1941—1942 году да нас у кватэру зайшлі пагрэцца два немцы са спыненага цягніка. Убачыўшы чацьвярых маленькіх дзяцей, найперш раскрылі свае заплечнікі і падзяліліся сваёй пайкаю, дзецям далі цукеркі. Я памятаю іхнія словы: «Война плохо. Гитлер капут». У мамы папрасілі кіпеню, паелі, выпілі гарбаты, пагрэліся й сышлі да цягніка. Іншыя ж заходзілі тлумнымі кампаніямі, пілі гарбату, елі і пры гэтым спаборнічалі ў пердзяжы, гарлалі й сьмяяліся.

Бліжэй да восені 1942 году на чыгунцы пачаліся першыя дывэрсіі, зьявіліся чуткі пра партызанаў. У памяці маёй не захавалася ніякай цікавай інфармацыі, толькі памятаю пастаянны рух цягнікоў: гружаных нямецкай тэхнікай — на ўсход, цягнікі зь нявольнікамі — у адваротным кірунку, у Нямеччыну.

Зіму 1943—1944 году мы перабылі ў вёсцы Вуглы, прытуліла нас сям'я Шаура (зноў дапамаглі татавы саслужыўцы). У той час у вёсках было шмат дзяцей, мы амаль усе дні напралёт бавіліся: каталіся на санках, коўзаліся на драўляных каньках, на дашчэчках-лыжах. Часамі старэйшыя дзеці зладжвалі нам, малечам, сьвята — уся дзятва ўсаджвалася на конскія сані, што стаялі на самым высокім пункце вуліцы, наперадзе саней з канькамі на нагах садзіўся рослы дзяцюк. Сані разганялі, і мы імчалі вуліцаю на вялікай хуткасьці з крыкамі захапленьня, а нам усьлед несьліся пагрозы бацькоў. Вясёлая кампанія

даяжджала да самай рачулкі Жодзінка. У той час у раёне Вуглоў яна была да трох мэтраў ушыркі.

А нашыя бацькі і ўсё дарослае насельніцтва жылі ў пастаяннай трывозе: удзень немцы ходзяць па вёсцы, выпытваюць пра партызанаў, ловяць курэй, парсючкоў. А ўначы па Вуглах ходзяць партызаны: зьбіраюць інфармацыю пра немцаў. У кожнай вёсцы ў партызанаў былі свае агенты, якія працавалі ў немцаў на чыгунцы, ва ўправе, на складах; каб не выдаваць іх, партызаны заходзілі ва ўсе хаты.

Улетку 1943 году бацька часта хадзіў у лес то зь сякерай, то з кошыкам і пастаянна браў мяне з сабою. Часта ў лесе сустракаўся з узброенымі мужчынамі, часамі даволі доўга гутарыў зь імі, адышоўшыся ўбок. Я гэта добра памятаю, мне ў той час ужо ішоў дзявяты год.

Ох, які багаты, цудоўны лес быў пад Будагавам: грыбоў, ягадаў процьма — мы з татам заўсёды прыходзілі дадому з поўнымі кошыкамі адборных маленькіх баравікоў. Бацька быў цудоўны грыбнік.

Згадваючы тыя гады, упершыню задумаўся, чаму ў той час бацька перавёз сям'ю ў Вуглы. Па-мойму, адказ просты. Жыць ля вакзалу зрабілася небясьпечна. Зьяўляючыся тайным агентам партызанаў і адначасова перадатачным зьвяном ад чалавека партызанаў у Жодзінскай управе (пра гэта я даведаўся ад бацькі па вайне), жыць у Жодзіне — значыць рызыкаваць ня толькі сабою, але й усёю сям'ёй. А ў Вуглах лес побач, пры першым сыгнале можна было схавацца ў партызанаў.

Трэба аддаць належнае вуглаўчанам — з жыхароў Вуглоў ні адзін мужчына не пайшоў у паліцэйскія, не было ў вёсцы сексотаў, тут ніхто з партызанаў ня трапіў у пастку ворага. Вуглаўчане, служачы ў немцаў у асноўным з эканамічных меркаваньняў, умелі выведваць патрэбную партызанам інфармацыю і пэрыядычна іх ёй забясьпечвалі.

Яшчэ адной крыніцай інфармацыі былі жанчыны, якія жылі зь немцамі. Партызаны здолелі знайсьці да іх падыход. І часта ад гэтых жанчын атрымлівалі больш

каштоўную, можна сказаць, эксклюзіўную, інфармацыю. Яны ведалі ад сваіх сужыцеляў сапраўдны стан рэчаў на франтах. Дзьвюх такіх жанчын я ведаў асабіста, да вайны я бачыў іх у нас дома. А ўвесну 1944 году сустрэў на вуліцы вёскі Чэмкі, што знаходзілася ў партызанскай зоне.

На пачатку восені 1943 году бацька прыйшоў з працы занепакоены, ён доўга пра нешта шаптаўся з мамаю. Праз пэўны час бацька выйшаў з дому, а маці пачала складаць нашае «багацьце» ў клункі ды валізы. Ужо ўначы нас, дзяцей, пабудзілі бацькі й пасадзілі ў падводу, запрэжаную канём. Паехалі дарогаю да Будагава. Пад'язджаючы да лесу, бацькі з трывогаю пачалі ўглядацца ў цемру. Я таксама паглядзеў туды, куды былі скіраваныя іх позіркі. Убачанае спалохала мяне. Проста на нас, як мне падалося, плылі чатыры цені. Калі яны наблізіліся, я разгледзеў людзей са зброяй у руках. Яны загадалі нам спыніцца. Калі начныя людзі падышлі да самай падводы, адзін зь іх пазнаў бацьку. Адзін сказаў: «Горача ў Вуглах табе стала, Антон Іванавіч, едзьце, дарога правераная намі». Адвёўшы тату ўбок, яны пэўны час размаўлялі сам-насам.

У Будагава мы прабылі тры дні, спыніліся ў добрага татавага знаёмага, які ўсе тры дні частаваў нас мёдам. Для нас, дзятвы, гэта было сьвята.

Наш пасьпешлівы выезд з Вуглоў быў выкліканы тым, што немцы раскрылі групу падпольшчыкаў на станцыі Жодзіна; уначы, калі мы зьехалі ў Будагава, бацьку мелі арыштаваць. Пра гэта я даведаўся ад таты ўжо дарослым. Задума немцаў стала вядомая падпольшчыку, які працаваў у Жодзінскай управе, бацька перадаў яе па ланцужку. Аднак ня ўсім пашчасьціла перахавацца: большасьць была схопленая гестапа і пакараная сьмерцю ў Барысаве; разам зь імі быў пакараны сьмерцю й немец, начальнік станцыі, які са спачуваньнем ставіўся да сваіх падначаленых, а часамі даваў інфармацыю партызанам.

На другі дзень бацька пайшоў на размову да камандзіра партызанскай брыгады «Сьмерць фашызму». Празь дзень прыехаў на падводзе засмучаны. Пагрузіўшы на падводу

сваё «багацьце» і ўсадзіўшы дзяцей, зноў рушыў у шлях. Праз пэўны час мы прыехалі ў вёску Чэмкі ды спыніліся жыць у Івана Невяровіча. У невялікім доме жыла вялікая сям'я. І нас пяцёра чалавек.

Глава сям'і быў даволі калярытнай асобай: вялікі рабацяга, невысокі, худзенькі, пастаянна ўсьміхаўся. Было ў яго хобі: зьбіраў усё, што было зьвязана з курэньнем: люлькі, крэсіва, кнот, муштукі. У вольны ад працы час, а гэта было ўзімку, у глухія, цёмныя вечары, забіраўся на печ, высыпаў з торбы свае скарбы і пры лучыне перабіраў калекцыю, пры гэтым шчасьліва ўсьміхаўся.

Наступным днём я пайшоў знаёміцца зь вёскай. Чэмкі на той час былі даволі вялікаю вёскаю. Дамы стаялі шчыльна па абодва бакі вуліцы. Вёска была шматлюднаю. Гэта й зразумела: карэннае насельніцтва, партызанскія сем'і і ўзброеныя мужчыны на вуліцах (за тры кілямэтры ад Чэмак у лесе знаходзіўся партызанскі атрад імя Чкалава брыгады «Сьмерць фашызму»).

У 2005 годзе я наведаў Чэмкі. Вёска распалася на паасобныя хутары: побач з хатамі-развалюхамі сучасныя дамы, амаль ля кожнага дому тэхніка: трактары, легкавыя аўтамабілі, невялікі грузавічок. Жыцьцё тут працягваецца.

Вяртаючыся да тых далёкіх часоў, аналізуючы падзеі, запісваючы гэтыя радкі, я прыходжу да высновы, што карэннае насельніцтва Чэмак вяло натуральную гаспадарку, бо вакол невялікімі палоскамі быў пасеяны авёс, ячмень, гарох, жыта, бульба. У кожнага гаспадара ў хаце ганаровае месца займаў ткацкі станок — кросны, прыстасаваньне для размолу зерня — жорны, для вырабу крупаў — ступа. Хату атачалі сьвіран, хлеў, дрывотня. У канцы зямельнага ўчастку Невяровіча цякла рэчка Цна. Бацька амаль адразу, па падказцы вяскоўцаў, пачаў дасьледаваць рэчышча, на працягу двух дзён бясконца нырцаваў у ваду і нарэшце, да вялікай радасьці, дастаў з дна вінтоўку. Наступным днём ён яе чысьціў ад бруду, разьбіраў, змазваў, шчоўкаў затворам. Ня цягнучы, пайшоў партызаніць у атрад імя Чкалава.

Яшчэ памятаецца мне перадзім’е: засеяныя жытам палі, каровы, коні, што пасуцца марознымі днямі на яшчэ зялёным беразе ракі...

А ў перанаселенай вёсцы пачаў лютаваць тыф. Нашую хату гэтая зараза абыйшла. Партызанскія лекары дапамагалі жыхарам вёскі. Цёмная, сырая, з частымі дажджамі восень, халодная сьнежная зіма, вясна зь яе раздарожжам і паводкаю Цны цягнуліся бясконца доўга. А яшчэ калі да сказанага дадаць частыя налёты самалётаў нямецкае авіяцыі, што сеялі сваімі кулямі сьмерць, дык зразумела, як нудна й страшна было і дарослым, і дзецям. А вось бамбёжак ня памятаю. Ад нямецкіх куляў мы хаваліся ў зямлянцы недалёка ад хаты. Ня памятаю я і дзіцячых забавак. Гэта зразумела — падраная вопратка, стаптаны абутак, а галоўнае — паўгалоднае існаваньне зрабілі нас маларухомымі, соннымі істотамі: у гэтых лядашчых чалавечках, здавалася, ледзь цьмела жыцьцё.

Вялікі дзякуй Невяровічам — дзяліліся з намі сваімім сьціплымі прыпасамі. Я ня памятаю ніводнага канфлікту паміж нашымі сем’ямі.

Бацька часта прыходзіў даведацца нас, часамі прыносіў харчы, ладзіў наш кепскі абутак. А галоўнае, гаварыў, што хутка нашыя войскі будуць на тэрыторыі Беларусі.

Дружная цёплая вясна ўвайшла ў свае правы. Сяляне шчыравалі на сваіх палетках, памятаючы, што вясновы дзень год корміць, дапамагалі ім і партызанскія сем’і. Старэйшыя давалі нам, малым, заданьні — зьбіраць шчаўе, крапіву, лебяду. На ўсё жыцьцё я запомніў гэтае поснае, слабасалёнае (соль была дэфіцытам) зялёнае варыва. Гэтая вітамінная ежа, якую можна было не эканоміць, ажывіла нас. Мы, малыя, бегалі ў найбліжэйшы лес у пошуках першых ягадаў: суніцаў, чарніцаў. Ішла актыўная барацьба за выжываньне.

Недзе ў другой палове чэрвеня бацька прыехаў на падводзе і загадаў маці грузіцца й ехаць на балоты возера Палік. Тады ўпершыню я пачуў слова *блякада*. Назаўтра мама пасадзіла нас, чацьвярых сваіх дзяцей, на падводу; Толя ў свае чатыры гады не хадзіў — хварэў на рахіт.

Рэчаў не было ніякіх, маці абмяняла іх на бульбу, соль, запалкі. Я й цяпер памятаю гэтую дарогу сьмерці. Такіх бежанцаў, як мы, набралася шмат, вялікі абоз. Да Паліку мы дабіраліся блізу двух дзён у суправаджэньні нямецкае авіяцыі. Галоўным возьнікам быў я: мне падабалася кіраваць гэтым невялікім канём, што не баяўся рову нямецкіх самалётаў. Пры налёце нямецкіх самалётаў я заўсёды патрапляў скіраваць каня й воз пад кроны дрэваў, і самі мы хаваліся непадалёк ад возу пад густымі кронамі дрэваў. Пасьля кожнай бамбёжкі былі чуваць плач і стогны людзей. За гэтыя тры дні абоз значна парадзеў, а дарога ўсеялася трупамі людзей і коней.

Памятаецца, як, праяжджаючы міма нас на кані, партызан зьвярнуўся да маці з такою фразай: «Жанчына, навошта ты вязеш дзяцей у Палік? Гэта верная сьмерць, заставаліся б лепей у вёсцы». Мама яму нічога не сказала. Мы працягвалі рух. Да вечара мы ўперліся ў непралазнае балота, якое ўяўляла зь сябе густы хвойнік, што патанаў у зарасьцях багуну й буякоў; прысядзеш — і цябе ўжо ня бачна. Мама павяла нас, траіх дзяцей, а чацьвертага, Толю, панесла на руках у нашае новае жытло — балота. Мне ішоў ужо дзясяты год.

На другі дзень пачулася страляніна ды разрывы бомбаў. Нам, дзецям, хацелася паесьці, нашыя невялікія дарожныя запасы скончыліся ўчора ўвечары. Маці агледзелася навокал ды сказала: «Будзем харчавацца маладымі парасткамі хвоі ды буякамі». Пасьля паглядзела на нас і, каб падбадзёрыць, вымавіла: «Ды вы зусім зьмерзьлі за ноч, падымайцеся, давайце пройдземся, сагрэемся».

Канец чэрвеня ў 1944-м выдаўся сонечным і цёплым, аднак на тарфяным сырым балоце ўначы было халодна. Спалі мы, шчыльна прыціснуўшыся сваімі худзенькімі цельцамі да мамы.

Да вечару гэтага дня нямецкія ланцугі ўвайшлі ў балота, пачулася страляніна, брэх сабак, гамана немцаў. Мы схаваліся ў высокім густым дурманлівым багуне, дзе й пераначавалі. Зьзябнуўшы, усталі з узыходам сонца і пабрылі па балоце, саграваючыся й аднача-

сова падсілкоўваючыся парасткамі хвоі ды буякамі. Я заўважыў, што маці са сполахам глядзіць у адно месца, паглядзеў туды і я. Гэта была жудасная карціна. Паўсюль ляжалі целы забітых старых, жанчын і дзяцей — учорашняе зьверства немцаў. Маці рэзка зьмяніла кірунак руху. Я заўважыў, што мама з пабачанага зрабіла выснову: трэба баяцца і немцаў, і сваіх — вялікай колькасьці людзей цяжэй затаіцца. Так мы ў адзіноце блукалі балотам сярод немцаў і нешматлікіх пазасталых ужывых сваіх, часта сустракаючы на сваім шляху нябожчыкаў, якія ўжо пачалі раскладацца. Я заўважыў, што з пэўнага часу немцы пачалі хадзіць па балоце не ланцугом, а цугам, трымаючы на кароткім павадку сваіх аўчуганаў, якія з брэхам ірваліся ў бакі; немцы не адпускалі іх, бо сабакі брахалі як на жывых, гэтак і на мёртвых людзей; пэўна, карнікі лічылі праціўніка ў асноўным зьнішчаным.

У такім бадзяньні прайшлі ўжо тры ці чатыры дні. Немцы працягвалі адстрэльваць партызанаў, старых, жанчын і дзяцей. Халодныя ночы, адсутнасьць харчу адбіліся на нашым самаадчуваньні: мы сталі вялымі, абыякавымі, соннымі, ужо не хаваліся, ужо сунуліся сьцежкамі, пракладзенымі ланцугамі немцаў. Пачуўшы гамонку фрыцаў, брэх сабак, мы хаваліся за 15—20 мэтраў ад сьцежкі і заціхалі. Цяжэй за ўсё было чатырохгадоваму Толю; мама ўціскала ягоны твар у мох са страху быць заўважанымі немцамі. Толя быў шумны малы: пастаянна прасіў есьці, плакаў, капрызіў. Аднойчы, прачнуўшыся на золку ад холаду, мы пачулі нязвыклую цішу раніцы: не было чуваць страляніны, брэху сабак, гулу нямецкай тэхнікі. Так мы праседзелі на адным месцы, пакуль не прыпякло сонейка. Мама ўсё прыслухоўвалася, нарэшце сказала: «Дзеці, напэўна, скончылася блякада, зараз пойдзем да партызанскіх зямлянак, тут недалёка». Я ня ведаю, як яна арыентавалася ў гэтым непраходным балоце, яна ж у гэтых мясьцінах была ўпершыню. Мама зь дзіцём на руках ішла зь цяжкасьцю, аднак падбадзёрвала нас, падганяла. Я ня памятаю, колькі часу мы ішлі. Калі мы выйшлі на ўскраек хвойніку, дык убачылі, што немцы

тут пазьверствавалі болей, чым на балоце, — мноства чалавечых і конскіх трупаў ляжалі ў розных позах. Тут жа стаялі падводы, на іх — трупы дзетак. Стаяў моцны трупны пах. Маці пастаралася хутка вывесьці нас з гэтага лесу. Мы ішлі зь вялікімі намаганьнямі, апухлыя ад голаду. Празь некаторы час уперадзе на паляне мы ўбачылі людзей, падобных на жывыя шкілеты, няшмат, чалавек 20-25. Людзі знаходзіліся ў розных позах: хто ляжаў, хто сядзеў, хто зь цяжкасьцю рухаўся. Спыніліся тут і мы, удала — побач месьцілася партызанская зямлянка. Я заўважыў, што дзе-нідзе гараць вогнішчы і людзі нешта вараць у катлах. Я падняўся і зайшоў у зямлянку, у куце стаяла колькі драўляных бочак, я зазірнуў у адну, убачыў, што ў бочках намочаныя буракі. Пахадзіў па суседніх зямлянках, знайшоў пасудзіну, нешта накшталт вядра, набраў буракоў. Мы з мамай расклалі вогнішча, узяўшы агеньчык у суседзяў. Селі, чакаючы нашага абеду.

Раптам мы пачулі маладыя, бадзёрыя, вясёлыя крыкі. Я азірнуўся на галасы — да нас набліжаліся два маладыя здаравякі ў форме Чырвонай арміі. Калі гэтыя два чалавекі падышлі да нас бліжэй, мы пачулі: «Грамадзяне, уся Віцебская вобласьць і частка Менскай вызваленыя ад немцаў, выходзьце на дарогу Віцебск—Менск, ваенныя дактары дапамогуць вам». Гэтую вестку мы ўспрынялі з палёгкай, на большае ў нас не ставала сілаў.

Нашае варыва ўжо закіпела: я пастаянна падкідваў гальлё ў вогнішча. Маці сядзела побач, расчэсвала па чарзе валасы дочкам. Зірнуўшы на маці, я заўважыў, што яна некуды ўглядаецца, твар яе ажывіўся, тут жа яна ўсклікнула: «Дзеці, бацька ідзе!» І насамрэч, да нас набліжалася такая знаёмая й родная фігура ў такім знаёмым абрэзаным чыгуначным шынялі, у лапцях, зробленых з халяваў ботаў, — наш тата. Мы, дзеці, зь цяжкасьцю падняліся й пабеглі да яго насустрач, нашай радасьці не было межаў. Мама з Толем на руках сядзела і чакала, пакуль бацька падыйдзе. Твар таты асьвяціўся радаснаю ўсьмешкаю. Расцалаваліся. Бацька тут жа зазірнуў у нашую пасудзіну з варывам, дастаў са сваёй торбы колькі бульбінаў, абабраў, апусьціў

у нашае вядро. Дастаў яшчэ невялікі скрутак, разгарнуў, у ім апынулася каштоўнасьць — соль. Праз пэўны час ён дастаў са свайго рэчмяшка кубак і лыжку й пачаў з Толі па чарзе нас карміць гэтай баландой; у кубку яе было толькі на донцы. Нібыта перапрашаючы, ён сказаў, што ў нашым становішчы адразу шмат есьці нельга — можна памерці. Так, маленькімі порцыямі гэтай баланды бацька нас падкормліваў на працягу дня. Зьлева ад нас чуўся ўсё бліжэйшы шум тэхнікі.

Ноч мы, дзеці, правялі, шчыльна прытуліўшыся да бацькоў, прыкрытыя бацькавым шынялём. Прачнуліся, калі прыпякло сонейка. Бацька падкарміў нас ужо крыху павялічанай порцыяй учарашняга бураковага супу. Зьлева ад нас ужо моцна гула тэхніка. Бацька сказаў нам: «Ну, дзеці, хадзем на сустрэчу з чырвонаармейцамі». Наш маленькі фізычна аслаблы атрад рушыў у шлях. Сьпераду ішоў бацька, несучы на руках Анатоля, ланцужок замыкала мама, несучы на руках кацялок з рэшткамі ўчарашняе ежы. Наш шлях ішоў па мяжы балота і ўзьлесься. Цяжкім быў гэты шлях фізычна й маральна: мы даволі часта сустракалі нябожчыкаў, па адным і групамі, у розных позах. Трупны пах немагчыма было трываць. У гэтым разе бацька паскараў хаду й прысьпешваў нас. Нарэшце мы наблізіліся да дарогі Віцебск—Менск. Пабачылі ваенную тэхніку, што рухалася: танкі, аўтамашыны, гарматы.

Бацька пасадзіў нас у цяню дрэваў, а сам пайшоў на дарогу. Празь нейкі час ён прыйшоў са сталым афіцэрам, той уважліва агледзеў нас, уздыхнуў і сказаў: «Хадзем са мной, партызан, я дам распараджэньне інтэндантам». У хуткім часе прыйшла жанчына-ўрач. Яна ўважліва агледзела кожнага з нас, адчыніла сваю ёмістую лекарскую сумку, дала маці нейкія таблеткі, расказала, як іх прымаць. Даючы кавалак мыла, сказала: «У першым жа вадаёме памыйцеся, моцна завашывелі». Пазычыўшы нам як найхутчэйшае папраўкі і шчасьлівай дарогі, сыйшла. А бацькі ўсё не было. Нарэшце зьявіўся бацька на возе і з грузам. Са скрыні дастаў бохан хлеба, адкрыў кансэрву; ён па-ранейшаму карміў нас маленькімі порцыямі. Падсілкаваўшыся, мы ўсе

ўселіся на воз і рушылі ў шлях. Позна ўвечары дабраліся да Бярэзіны, спыніліся на начлег. Бацькі вымылі нас у рацэ, накармілі, накрылі коўдрамі; мы соладка заснулі галышом, бо нашую вопратку памылі.

Наступным ранкам, падсілкаваўшыся, мы рушылі ў дарогу ў суправаджэньні эскорту з танкаў, грузавікоў і людзей у ваеннай форме.

На трэція суткі малады, сыты конь трушком прывёз нас у Жодзіна. Бацька, разгледзеўшыся на бакі, канстатаваў: «Здаецца, Жодзіна ад немцаў моцна не пацярпела». Праз паўзу, зьвяртаючыся да мамы, дадаў: «Мабыць, не было калі, бачыш, колькі іхняй баявой тэхнікі кінута». Я ўбачыў па дарозе да чыгуначнага пераезду танкі, грузавікі, легкавушкі, ужо часткова разабраныя.

Пад’ехаўшы да чыгуначнага пераезду, бацька спыніў каня, перадаў мне лейцы і сказаў: «Цікава, што там столькі цывільных ля вагона?» Праз колькі хвілінаў вярнуўся назад і сказаў: «Ваенныя раздаюць насельніцтву рыбін тлушч, пастаю ў чарзе». Да прыходу бацькі мама прыгатавала лыжку. Нам, дзецям, упершыню ў жыцьці давялося выпіць гэтае пахкай вадкасьці. Мне спадабалася. Да нашага жытла заставалася ўсяго нічога. Наблізіўшыся да нашага дому, мы ўбачылі на яго месцы парэшткі каміноў і кучу попелу. На месцы чыгуначнага вакзалу таксама тырчаў комін. На нашае шчасьце, другі жылы дом чыгуначнікаў захаваўся, ён апынуўся пустым. Мы засяліліся ў адну з кватэраў. Маці пачала гатаваць абед, а бацька, як дысцыплінаваны чыгуначны служачы, пайшоў прадставіцца ваеннай адміністрацыі станцыі Жодзіна. Вярнуўшыся, ён сказаў: «Загадана першым цягнікам прыбыць ва ўпраўленьне Беларускай чыгункі, цягнік ужо на падыходзе, дай хлеба й кансэрву». Бацька пайшоў на цягнік, пакінуўшы маці ў вялікай трывозе. А раптам забяруць у дзейную армію? Да канца наступнага дня зьявіўся бацька. Маці, пабачыўшы яго, ажыўлена, радасна запыталася: «Ну, што скажаш, Антоша?» Бацька з жартам, урачыста вымавіў: «Зацьверджаны начальнікам станцыі Жодзіна». Ён прыехаў не з пустымі рукамі. Кіраўніцтва

чыгункі распытала яго пра склад сям'і, напісала ліст у Чырвоны Крыж — там выдзялілі нам, дзецям, адзежу; аддзел харчаваньня рабочых выдзяліў бацьку 15 пачкаў аднаразовага харчаваньня — амэрыканскага, для салдатаў. Выплацілі бацьку месячны аклад. Мы ўсе ажылі душою. Бацькі па-ранейшаму кармілі нас маленькімі порцыямі, нячаста. За час нашага падарожжа пры стабільным харчаваньні мы падужэлі, зьявілася цікавасьць да жыцьця і навакольнага сьвету.

Падчас нашага падарожжа дадому я прыслухоўваўся да татавага аповеду пра ягоныя прыгоды. Брыгада «Сьмерць фашызму» на тысячу штыкоў з баямі адступіла ў раён возера Палік; калі немцы замкнулі кола блякады, у партызанаў скончыліся боепрыпасы; брыгада несла вялікія страты асабістага складу, да ўсяго зьнік камандзір брыгады (сярод мёртвых яго не знайшлі). Штаб брыгады прыняў рашэньне: байцам разгрупавацца й самастойна выходзіць з акружэньня і прызначыў месца збору. Бацька накіраваўся ў гарачы раён Паліку — шукаць сям'ю. Добры плывун і ныральнік, ён вырашыў хавацца ад немцаў у водах ракі Бярэзіна. Знайшоў ціхую пратоку (старык), рэчышча якой пакрытае гарлачыкамі й лілеямі, па берагах кустоўе. Як пачуе брэх сабак, дык адразу ў ваду з трубачкай у роце (пустая сьцяблінка якой-небудзь расьліны).

Аднойчы ён ледзь ня трапіўся немцам на мушку. А было гэта так. Пачуўшы брэх сабак і гамонку немцаў, ён сігануў у ваду; немец, што ішоў берагам, спыніўся і пачаў спраўляць малую патрэбу ў ваду, і трэба ж было, што ледзь не на галаву бацькі; пайшлі кругі па вадзе, немец убачыў кепку бацькі, якая перад гэтым усплыла. Немец нахіліўся, узяў галінку і дацягнуўся да кепкі — кепка свабодна перасоўвалася па вадзе. Таты ў вадзе, на шчасьце, фрыц не заўважыў.

Бацька расказваў, што многія ягоныя таварышы па зброі загінулі. Цяжка было і без прадуктаў. Часамі за дзень зьядаў усяго адну сырую бульбіну, а ў асноўным харчаваўся парасткамі хвоі. Як толькі ўсталявалася ў лесе цішыня, ён пайшоў нас шукаць.

Калі мы, дзеці, падужэлі, бацькі дазволілі выходзіць нам з дому. У дзяцінстве я быў даволі цікаўным. Аднойчы я вырашыў агледзець ваколіцы нашага дому, найперш накіраваўся да царквы і школы. Да чыгуначнай станцыі прымыкала саўгаснае поле, засеянае жытам (пры немцах засеянае, імаверна, плянавалі застацца ў Беларусі надоўга), па сьцяжынцы ў жыце наўпрост я дабраўся да царквы і школы і замаркоціўся, таму што немцы школу спалілі. Спалілі акупанты і свае прадуктовыя склады (яны знаходзіліся там жа, дзе сёньня склады Гархарчпрамторгу). Шмат усялякага нарабаванага дабра згарэла, у тым ліку горы зерня. Падасоўе ад немцаў не пацярпела.

У бацькі на працы было шмат цяжкасьцяў. З супрацоўнікаў станцыі Жодзіна ўжывых засталося пяць чалавек, астатніх дваццаць пяць чыгуначнікаў немцы пакаралі сьмерцю, выкрыўшы іхнюю сувязь з партызанамі. Падбор працаўнікоў, іх навучаньне, кантроль іх працы патрабавалі ад бацькі шмат часу. Бо ж цягнікі з ваеннай тэхнікай і з войскамі ішлі на захад суцэльнай плыньню. Усе клопаты пра дзяцей і хатнюю гаспадарку леглі на плечы мамы, да таго ж мама працавала білетным касірам.

Бліжэй да восені на ўсход пайшлі грузавыя цягнікі (праўда, нячаста). З закратаванымі вокнамі вагонаў, з латкамі ў дзьвярах для спраўленьня патрэбаў пасажыраў. Аднойчы такі цягнік спыніўся на нашай станцыі, з вагонаў чуліся жаночыя й дзіцячыя галасы. Гаворачы сучаснаю моваю ваенных, НКВД рабіў зачыстку вызваленых тэрыторыяў ад варожых элемэнтаў. Цягнікі ішлі пад узмоцненай аховай.

Ад бацькоў я тады чуў, што ўначы прыходзіў чорны варанок, забраў некага з жыхароў Жодзіна.

Першага верасьня 1944 году я зь Любай пайшоў у першую клясу; школы месьціліся ў прыватных дамах. Я зь Любай хадзіў у школу вёскі Касьё.

Так пачалося мірнае жыцьцё. Хаця да канца вайны было яшчэ далёка.

*Зіма—вясна 2008 г.*

# Зьмест

*Алесь Аркуш*
**Брызгалаўка: Жодзінскія аповеды, успаміны і вершы**

Сьвятло вясны ........ 5
Было балота ........ 7
Пад шатамі старых ліпаў ........ 9
***на царковішчы ........ 11
***шлях ад электрычкі ........ 12
Крама на вуліцы Спартыўная ........ 13
Дом культуры ДРЭС ........ 16
***зь дзяцінства ня меў ........ 24
***сябар-аднаклясьнік ........ 25
Балотная рака ........ 26
Брызгалаўка ........ 30
На рыбалку на фантаны ........ 34
Плаціна ........ 36
***у Жодзіне на мосьце ........ 39
***прызначыў табе спатканьне ........ 40
***на Судабоўскім возеры ........ 41
Катаньне на плыце ........ 42
Санча і Панса ........ 45
***пачнем спачатку ........ 52
***марыць па-сапраўднаму ........ 53
Дзень вызваленьня ........ 54
Напярэдадні Радаўніцы ........ 59

*Барыс Козік*
**Каля чыгункі**

Мае ўспаміны пра вайну ды мінуўшчыну ........ 67

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Алесь Аркуш, Барыс Козік
**Брызгалаўка:**
**Жодзінскія аповеды успаміны і вершы**

Пераклад: Марына Салавей
Карэктура: Марыя Гірдзюк
Вокладка: Сяргей Ждановіч
Вёрстка: Сяргей Кандраценка

Падпісана ў друк 19.12.2008. Фармат 84×108/32.
Друк афсэтны. Папера афсэтная. Гарнітура PetersburgC.
Ул.-выд. арк. 4,5. Наклад 300. Замова .

Выдавец І. П. Логвінаў.
ЛВ 02330/013307 ад 30.04.2004 г.
Пр-т Незалежнасці, 19-5, г. Мінск, 220050.
logvinovpress@mail.ru

Надрукавана на капіравальна-памнажальнай тэхніцы
ІП Логвінава

**Кніжная сэрыя «Кнігарня «Наша Ніва» заснаваная ў гонар 100-годзьдзя газэты «Наша Ніва»**

**Раней выйшлі ў сэрыі:**

**Андрэй Хадановіч.** «Сто лі100ў на tut.by»
**Андрэй Хадановіч.** «Бэрлібры»
**Пётра Рудкоўскі.** «Паўстаньне Беларусі»
**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко.** «Беларусь за дзесяць падарожжаў»
**«Жанчыны выходзяць з-пад кантролю».** Беларускае жаночае апавяданьне
**Сямён Печанко.** «У Беларускім войску»
**«Застаемся!».** Сакавік 2006: прыватнае і агульнае»
**Наталка Бабіна.** «Крыві не павідна быць відна»
**Наталка Бабіна.** «Рыбін горад»
**Алесь Кудрыцкі.** «Суд на Каляды»
**«Бабілёнская бібліятэка».** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы»
**«Найясьнейшая Рэч Паспалітая».** Цывілізацыя. Культура. Рэлігія. Палітыка. Авантура. Героіка. Успамін
**Віталь тарас.** Звыклае зло.
**«Паветраны шар».** Беларускае мужчынскае апавяданьне
**Павал Севярынец.** Лісты зь лесу
**Павал Севярынец.** Люблю Беларусь
**«Вясна народу».** Эсэістыка 1991 — 2007
**Пётр Краўчанка.** «Беларусь на ростанях: нататкі дыпламата і палітыка»
**Валянцін Тарас.** «На высьпе ўспамінаў»
**Наталка Бабіна.** «Рыбін горад»
**Ева Вежнавец.** «Шлях дробнай сволачы»
**Франц Сіўко.** «Дзень Бубна»
**Артур Клінаў.** «Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца»
**Лёлік Ушкін.** «Левым вокам»
**Васіль Быкаў.** «Пахаджане»
**Васіль Быкаў.** «Сьцяна»
**Павал Касьцюкевіч.** «Душпастарскія спатканьні для дачнікаў»
**Рышард Капусцінскі.** «Імперыя»

**Пытайцеся ў кнігарнях і незалежных распаўсюднікаў**

**У выдавецкіх праектах «Кнігарні «Наша Ніва» на 2009 год**

**Алесь Белы.** «Наша страва»
**Анджэй Суліма Камінскі.** «Рэспубліка супраць аўтакратыі: Рэч Паспалітая і Расія, 1686—1697»
**Анджэй Суліма Камінскі.** «Гісторыя Рэчы Паспалітай многіх народаў: 1505—1795. Грамадзяне, дзяржава, супольнасьць, культура»
**Спадчына Вялікага Княства.** Вялікае Княства Літоўскае на старонках «Нашай Нівы» 1991—2006.
**Арсень Ліс.** «Gloria victis». Збор твораў
**Алесь Кудрыцкі.** «Плястыляндыя»

**Пытайцеся ў кнігарнях і незалежных распаўсюднікаў**

Кнігарня Наша Ніва